Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ВЕРАСЕНЬ 29 1933 г. ПЯТНІЦА № 215 (4759)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся.

## АДКРЫЎСЯ ЎСЕТАТАРСКІ З'ЕЗД КАЛГАСНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

КАЗАНЬ, 28. (ТЭЛЕГРАМА-МАЛАНКА АД НАШАГА СПЕЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА).

АДКРЫЎСЯ З'ЕЗД УДАРНІКАЎ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПАЛЕЎ І ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ ТАТАРЫ. НА ГЭТЫМ ВЯЛІЗАРНЫМ З'ЕЗДЗЕ ПРЫСУТНІЧАЮЦЬ ДЭЛЕГАТЫ ПРОЛЕТАРСКІХ ЦЭНТРАЎ, БРАЦКІХ РЭСПУБЛІК, КРАЁЎ, АБЛАСЦЕЙ.

БУРНАЙ АВАЦЫЯЙ СУСТРЭЎ З'ЕЗД З'ЯЎЛЕННЕ Ў ПРЭЗІДЫУМЕ МАРЫІ ІЛЬІНІШНЫ УЛЬЯНАВАЙ. ПАД ГУКІ «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА» і «УРА» ВЫБРАНЫ Ў ГАНАРОВЫ ПРЭЗІДЫУМ т. т. СТАЛІН, КАГАНОВІЧ, МОЛАТАЎ, ВАРАШЫЛАЎ, КАЛІНІН, АРДЖАНІКІДЗЕ, КУЙБЫШАЎ, ТЭЛЬМАН, ГОРКІ, РАЗУМАЎ.

З ПРЫВІТАННЕМ ВЫСТУПІЛА МАРЫЯ ІЛЬІНІШНА.

МІКУЦКІ.

## ПАЛІТВУЧОБА—ВАЖНЕЙШАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ СПРАВА

Першыя вынікі чысткі з усёй відавочнасцю паказалі велізарны палітычны і ідэйны рост нашай партыі. Гэты рост палітычнага ўзроўня членаў партыі непарыўна звязан з агульнымі перамогамі, дасягнутымі партыяй на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва, з не непрымірымай барацьбой з класавымі ворагамі і іх агентамі—апартуністамі і з'яўляецца рэзультатам вялікай штодзённай выхаваўчай работы, якая праводзілася і праводзіцца нашай партыяй.

«Я думаю, — сказаў тав. КАГАНОВІЧ у сваёй прамове «Аб чысткі партыі», — што ў справе ўсваення праграмы, статута і важнейшых пастаноў партыі мы за паўгода чысткі дабіліся такіх рэзультатаў, якіх пры нармальнай прапагандысцкай рабоце мы дабіліся-б толькі праз пару год». Чыстка партыі сапраўды дала новы штуржок велізарнаму росту тэарытычных і палітычных запатрабаванняў членаў і кандыдатаў партыі. Самі сходы па чысткі, дзе высоўваюцца і разглядаюцца разнастайныя пытанні тэорыі і практыкі работы нашай партыі, адыгрываюць велізарную выхаваўчую ролю ў палаўненні ведаў як комуністаў, так і беспартыйнага актыва. На прыкладзе аддання барацьбы за соцыялізм, лепшых, найбольш свядомых перадавікоў рабочага класа, дапамагаючы камісіям у выяўленні чужых і разлажыўшыхся элементаў, яны глыбей і паўней усведамляюць сабе, да чаго абавязвае прыналежнасць да партыі, якім павінен быць комуніст.

Такім чынам пачатак сістэматычнай асенні-зімовай вучобы ў гэтым годзе мы сустракаем ва ўмовах павышанай па запатрабаваннях і вялікай па аб'ёму цягі комуністаў і беспартыйнага актыва да вывучэння рэвалюцыйнай тэорыі. Добрае і правільнае выкарыстанне гэтых умоў можа даць наступіўшаму навучальнаму году ў партыйнай сетцы велізарныя поспехі. Задача райкомаў партыі, парткалектываў і прапагандыстаў—замацаваць выкліканы чысткай велізарнейшы інтарэс да партвучобы ПРАВІЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ І ПАВЫШЭННЕМ ЯКАСЦІ ЎСЕЙ РАБОТЫ СЕТКІ ПАРТЫЙНАЙ АСВЕТЫ.

Неабходнасць правільнай арганізацыі і павышэння якасці партыйнай вучобы з асаблівай настойлівасцю дыктуюць ускрытыя ў працэсе чысткі сурёзныя недахопы ў рабоце па марксіцка-ленінскім выхаванні. Старшыня рэспубліканскай камісіі па чысткі тав. АНЦІПАЎ у сваім артыкуле (апублікаваным у «Правде» і «Звяздзе») аб ходзе чысткі партыі ў Беларусі, прывёў дзіўныя лічбы. На заводзе «Большэвік» (Менск) 30 проц. комуністаў, прашоўшых чыстку, не адказалі на самыя элементарныя пытанні. На фабрыцы «Кастрычнік» 40 проц. комуністаў зусім не наведваюць ніякіх школ. У Гомелі, у вагонным дэпо 25 комуністаў прызналіся, што зусім не чытаюць газет.

Трэба адзначыць, што палітнепісьменнасць часткі комуністаў не заўсёды тлумачыцца іх нежаданнем вучыцца. На многіх выпадках гэта тлумачыцца выключна слабай пастаноўкай выхаваўчай работы, недаацэнкай значэння і ролі рэвалюцыйнай тэорыі з боку асобных кіраўнікоў партыйных арганізацый.

Партыя неаднаразова ўказвала, а ў сувязі з чысткай з асаблівай сілай падкрэсліла, што ад кожнага комуніста патрабуецца яснае разуменне вялікіх задач, якія партыя ставіць у сваёй праграме, пастановах з'ездаў, патрабуецца яснае разуменне канкрэтных шляхоў нашай барацьбы за соцыялізм. Нізкі ўзровень ідэйнай узброенасці, палітычная малапісьменнасць, няўменне звязаць прынцыпы большэвізму з бягучай работай часта служаць харчовай базай для апартуністычнага разрыва слова і справы, крыніцай расхіствання партыйнай дысцыпліны.

Рэвалюцыйная тэорыя МАРКСА - ЛЕНІНА-СТАЛІНА ўзбройвае комуніста класавай пільнасцю, воляй да барацьбы супроць усялякіх праўленняў апартунізму, расхлябанасці, недысцыплінаванасці, узбройвае яго воляй расціць у сабе сілу сапраўднага партыйнага кіраўніка, здольнага весці за сабой масы, умацоўваць сувязь з імі і ўзнімаць іх на барацьбу за новыя перамогі.

Важнейшая задача партыйнай асветы зараз — сістэматычна растлумачваць прынцыпова-тэарытычнае і практычнае значэнне дырэктыў партыі і ўрада аб кіраўніцтве сельскай гаспадаркай, аб перабудове транспарта, аб рабоце прамысловасці і г. д. У ТОЙ МЕРЫ, У ЯКОЙ ПАРТЫЙНАЯ АСВЕТА БУДЗЕ СПРЫЯЦЬ МАБІЛІЗАЦЫІ ПАРТЫЙНЫХ СІЛ НА ВЫКАНАННЕ ПАРТЫЙНЫХ ДЫРЭКТЫЎ, ЯНА АКАЖА САПРАЎДНУЮ ДАПАМОГУ ВЫКАНАННЮ НАРОДНА-ГАСПАДАРЧЫХ ПЛАНАЎ.

Першыя дні вучобы ў радзе гарадскіх партарганізацый далі не зусім добрыя рэзультаты. Яны паказалі 1) нездавальняючае камплектаванне слухачоў; 2) слабы падбор прапагандыстаў; 3) слабую увязку тэорыі з практыкай.

Камплектаванне ў асобных парткалектывах МЕНСКА, ГОМЕЛЯ, БАРЫСАВА, РЭЧЫЦЫ, ОРШЫ і г. д. праведзена фармальна, без уліку ўзроўня падрыхтоўкі розных груп членаў і кандыдатаў партыі, без уліку выяўленай на чысткі палітпісьменнасці комуністаў. У паасобных мясцох (Бярэзінскі камбінат—Барысаў і інш.) камплектавалі кандыдацкія школы, у якіх кандыдаты партыі складаюць адну пятую частку, а чатыры пятых—беспартыйныя. Партсетка арганізуецца для членаў, кандыдатаў і спачуваючых партыі і ў школы могуць быць уцягнуты асабліва блізкія да нас беспартыйныя актывісты.

Дрэнная арганізацыя камплектавання школ прывяла ў радзе месц да фактычнага зрыва першых дзён партыйнай вучобы. Пры гэтым у большасці выпадкаў сарваліся заняткі імен на ў кандыдацкіх школах, г. зн. там, дзе патрабуецца больш за ўсё ўвагі, дапамогі і кіраўніцтва з боку культпропаў парткомаў.

Ужо на першых занятках ў радзе месц выявіўся дрэнны падбор прапагандыстаў. Напрыклад, у Рэчыцы ў трох гарадскіх школах кіраўнікі паказалі поўную сваю непадрыхтаванасць не толькі да заняткаў, але наогул да кіраўніцтва палітшколай. Такія выпадкі ёсць і ў Менску, і ў Оршы і г. д. Гэта тлумачыцца тым, што яшчэ да пачатка работы школ і гурткоў НЕ БЫЛО ВЫСТАРЧАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ СКЛАДА ПРАПАГАНДЫСТАЎ, НЕ БЫЛО ПЕРСАНАЛЬНАГА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ ІХ ПАРТЫЙНЫМІ КАМІТЭТАМІ. Выхаванне членаў і кандыдатаў партыі — вельмі адказная справа, і яна можа быць даверана толькі тым, якія могуць забяспечыць партыйна-вытрыманае выкладанне. За работу прапагандыстаў і за яе змест месяць адказнасць бюро ячэек і райкомы партыі. Гэта ўказанне культпропа ЦК УсеКП(б) трэба добра запомніць.

На занятках многіх школ паўтарыліся недахопы мінулага навучальнага года. Адным з гэтых недахопаў з'яўляецца слабая ўвязка тэарытычных пытанняў з сённяшнім днём, з практычнымі задачамі партыйнай арганізацыі. У гэтым напрамку трэба значна больш дапамагаць прапагандыстам.

Рост палітычнага ўзроўня членаў і кандыдатаў партыі, ускладненне задач партыйнай асветы з асаблівай вострасцю ставяць праблему КІРАЎНІЦТВА прапагандыстамі і наогул сеткай партасветы. Як і на ўсіх участках нашай работы, так і ў партвучобе павінна быць забяспечана канкрэтнае і аператыўнае кіраўніцтва. Асабліва культпропам трэба ведаць методыку партыйнай прапаганды, пастаянна правяраць работу прапагандыстаў, мець строгі ўлік паспяховасці і ўсваеньня слухачоў, на ходу выпраўляць памылкі і недахопы.

Ход чысткі партыі паказвае, што ёсць велізарныя магчымасці для ўзняцця справы партыйнай асветы яшчэ на большую вышыню. У надыходзячым навучальным годзе ўся палітвучоба павінна разглядацца, як важнейшая палітычная справа, як сур'ёзны абавязак кожнага партыйца, кожнай партарганізацыі.

# БССР засеяла толькі 79,6 проц. азімага кліна

## КОЖНЫ ДЗЕНЬ ДАЛЕЙШАЙ ЗАЦЯЖКІ СЯЎБЫ-УДАР ПА ЎРАДЖАЙНАСЦІ

### Замацаваць першыя поспехі

СЛУЦАК. Апошняя пяцідзённка дала рашучы пералом у справе азімай сяўбы ў аднаасобным сектары. Замест 80 проц. на 20 верасня план на 25 выкананы на 92 проц.

На гэты адстаючы ўчастак была звернута аспоўная ўвага ўсіх сельсоветаў і раённых арганізацый. Нанесен рашучы ўдар па кулацкай агітацыі, што «пельга сеяць рана».

А такая агітацыя была нашырана амаль што ва ўсіх сельсоветах раёна. У В.-Сліўскім сельсавеце кулацкая агітацыя мела поспех, усе аднаасобнікі вёскі Лясішча да 20 верасня засеялі толькі некалькі дзесяткаў га.

Па вёсках Вынесці і Ленская, Покрышаўскага сельскага совета, кулацкія падпявалы, члены сельсовета Лапковіч Дамінік і Лапковіч Сцяпан патуралі кулацкай агітацыі супроць сяўбы.

На членаў сельсоветаў прымацаваных да дзесяцідворак, была ўскладзена персанальная адказнасць за ход сяўбы. Члены сельсоветаў кожны дзень абыходзілі свае двары не толькі для кантролю, але і для арганізацыі дапамогі тым аднаасобнікам, якія сваімі сіламі не маглі ўкласціся ў даныя тэрміны.

Да суровай адказнасці былі прыцягнуты арганізатары кулацкага сабатажа сяўбы. Нарэд сурова пакараў кулакоў з Прошчыцкага і Ленінскага сельсоветаў, якія да 20 верасня не пачыналі сеяць.

У бязлітаснай барацьбе з кулацкім сабатажам сяўбы Слуцкі раён па вінен дабіцца сканчэння сяўбы ў бліжэйшыя дзень-два. А такая магчымасць у раёне ёсць.

Л.

### Аднаасобнік ігнаруецца

ЕЛЬСК. (Наш кар.). У раёне паўтараюць памылкі веснавой сяўбы. Аднаасобнік ігнаруецца, ва многіх сельсоветах працягваецца цяганіна з адводам зямель як для аднаасобнікаў, так і для калгасаў, што затрымлівае сяўбу.

Старшыня Кармянскага сельсовета Камароў не адвёў зямлі калгасу Дубровка. У калгас пяцёра ўступілі рад аднаасобнікаў, але зямля не далучана да калгасаў.

У Ельскім сельсавеце аднаасобніку Лашчэўскаму дана заданне пасеяць адзін гектар азімых, а зямля не адведзена. Аднаасобны сектар у сельсавеце засеяў толькі 33 проц. азімых. У Роза-Люксембургскім сельсавеце аднаасобнікам А. Мурга, М. Цалко і інш. зямля пад азімыя таксама не адведзена.

Райком партыі павінен неадкладна спыніць цяганіну з адводам зямлі і вінаватых прыцягнуць да адказнасці.

Ельскі.

### Скончыўшы сяўбу ўступілі ў калгас

Аднаасобнікі вёскі Кавалеўшчына, Вушацкага раёна, поўнасцю выканалі план сяўбы азімых. Аднаасобнікі арганізавалі дапамогу ў сяўбе суседняму калгасу «Чырвоная ніва». За дзень кожны аднаасобнік узараў па 0,38 га.

Пасля сканчэння работы аднаасобнікі ўсе як адзін заявілі: «Жадаем працаваць калектыўна, на аснове большэвіцкіх метадаў спаборніцтва і ўдарніцтва». Усе яны падалі заявы аб уступленні ў калгас.

Усё гэта вынік правільнага падыходу да аднаасобнікаў з боку члена сельсовета Смаргуна. Ён увесь час вяўзе сярод аднаасобнікаў шырокую растлумачальную работу. Смаргун сваячасова растлумачыў сваім аднавяскоўцам пра пастановы партыі і ўрада аб азімай сяўбе, аб цвёрдых пастаўках збожжа і г. д.

С.

### Перадавікі сяўбы

| РАЁН | Засеяна ўсіх азімых у проц. на 25 верасня | У тым ліку пшаніцы у проц. |
|---|---|---|
| Лельчыцкі | 99,3 | 90,0 |
| Чэрыкаўскі | 98,9 | 110,0 |
| Чырвонаслабодзкі | 98,6 | 100,1 |
| Нарыцкі | 98,1 | 92,0 |
| Полацкі | 97,4 | 102,8 |
| Слуцкі | 96,6 | 97,5 |
| Барысаўскі | 95,2 | 93,0 |

### Раёны, якія ганебна зацягваюць сяўбу азімых

*Засеяна на 25 верасня ў процантах*

| РАЁН | Засеяна азімых | У тым ліку Калгасамі | У тым ліку Аднаасобнікамі |
|---|---|---|---|
| ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ | 30,1 | 37,3 | 22,6 |
| ТУРАЎСКІ | 52,3 | 49,1 | 55,9 |
| ЗАСЛАЎСКІ | 60,3 | 59,3 | 57,9 |
| ЧАШНІЦКІ | 61,2 | 55,9 | 39,6 |
| БУДА-КАШАЛЁЎСКІ | 61,3 | 66,8 | 67,5 |
| НАРАЎЛЯНСКІ | 63,1 | 65,9 | 51,8 |
| ЛАГОЙСКІ | 64,6 | 68,9 | 62,6 |
| ДЗЯРЖЫНСКІ | 65,6 | 66,4 | 60,0 |

### Зрыўшчыкі сяўбы пшаніцы

| РАЁН | Засеяна ў проц. на 25 верасня |
|---|---|
| Чырвонапольскі | 3,0 |
| Плешчаніцкі | 15,0 |
| Мсціслаўскі | 27,8 |
| Расонскі | 30,5 |
| Крычаўскі | 30,7 |
| Чэрвеньскі | 32,5 |
| Заслаўскі | 33,0 |
| Гарадоцкі | 35,0 |
| Горацкі | 37,6 |

### Аршаншчына скончыла сяўбу азімых

ОРША. (Па тэлеграфу).

26 верасня раён скончыў сяўбу азімых. Заданне 26.300 гектараў—засеяна 26.390.—100,4 проц.

Райгазета „Ленінскі прызыў".

### АДВЕСЦІ ЗЯМЛЮ АДНААСОБНІКАМ

ЧАВУСЫ. (Наш кар.). Аднаасобнікі вёскі Рабяткі, Асінаўскага сельсовета, не засеялі ні аднаго гектара азімых.

Райзямаддзел і сельсавет разводзяць нечуваную цяганіну. Да сёняшняга дня аднаасобнікам гэтай вёскі не адведзена зямля пад азімы клін.

Валакітчыкі павінны быць прыцягнуты да адказнасці за ігнараванне аднаасобнікаў.

П. С.

### Кулацкі агент патурае зрыўшчыкам сяўбы

ОРША. (Наш кар.).

Пішчалаўскі сельсавет—найбольш адстаючы па сяўбе ў зоне дзейнасці МТС. На 20 верасня па сельсавету было засеяна толькі 65 проц. жыта і 50 проц. пшаніцы.

На пытанне, чаму не сеюць, старшыня сельсовета **Грынблат** адказвае: на полі стаіць яшчэ палова нязжатага аўса, а тое, што зжата—не звезена.

Вось як Грынблат «кіруе» сяўбой. Па яго думцы азімыя трэба сеяць па аўсянішчы, г. зн. па найгоршых папярэдніках.

Наогул Грынблат сваімі паводзінамі кампраметуе годнасць комуніста. Будучы старшынёю сельсовета, ён не лічыць патрэбным пацікавіцца як ідзе сяўба ў калгасах, у дзесяцідворках.

Калгасы сельсовета засмечаны кулакамі, якія зрываюць важнейшыя сельска-гаспадарчыя кампаніі, а Грынблату хоць-бы што. У тым калгасе, дзе жыве Грынблат, да апошняга часу арудвалі кулакі Сінчыла і Міхалёнак. Грынблат ведаў пра гэта, але рабіў выгляд, што не заўважае.

Гэта не выпадкова. Грынблат—сын спекулянта і арандатара. Ён прымаў актыўны ўдзел у камерцыйных справах свайго бацькі.

Аб «рабоце» гэтага перараджэнца ўжо некалькі разоў работнікі палітад дзела паведамлялі ў аршанскі РВК, патрабавалі зняцця яго. Аднак, вынікаў ніякіх няма.

Ёсць чуткі, што для расследвання дзейнасці Грынблата створана спецыяльная камісія. Але вынікаў яе работы нешта не відаць. Грынблат, як і раней, беспакарана патурае кулакам і зрывае асеннюю сяўбу.

В. Д.

### З ФРОНТА СЯЎБЫ АЗІМЫХ

*ПУХАВІЧЫ*

Сяўба пшаніцы адкладваецца напаследак. Калгасы «Сталінец», імя Чарвякова — Шацкага сельсовета, «Мацэвічы» — Суцінскага сельсовета, «Энергія» і «Новае жыццё» — Рудзенскага сельсовета не засеялі ні аднаго гектара азімых.

Многія калгасы яшчэ нават не забралі насенняй пшаніцы ў «Загатзбожжа» ў парадку абмена на другія культуры.

Зм. Б.

*ВЫКАНАЕМ СВОИ АБАВЯЗАК ПЕРАД ПРОЛЕТАРАМІ ЛЕНІНГРАДА*

# АДПРАЎЛЯЦЬ БУЛЬБУ МАРШРУТАМІ!

## ДА 27-га ВЕРАСНЯ АДГРУЖАНА ТОЛЬКІ 39,5 ПРОЦ. МЕСЯЧНАГА ПЛАНА.—НЕ ДАПУСКАЦЬ СКАПЛЕННЯ БУЛЬБЫ НА ПРЫЁМАЧНЫХ ПУНКТАХ

### Чыгунка падае нягодныя, брудныя вагоны

Сваячасовая адпрузка бульбы Ленінграду—баявая задача ўсіх арганізацый. У гэтай справе асабліва важнае значэнне набывае выразная работа ўсіх звеньняў транспарта.

Між тым весткі з месц сігналізуюць аб агідных фактах бюракратызма, падбайнасці ў арганізацыі пагрузачных работ і выкарыстанні паравозніка з боку адміністрацыі рада станцый і вузлоў.

На станцыі **Лепель** для пагрузкі быў паданы пульманаўскі 50-тонны вагон без люкаў. Адпраўка такога вагона прывяла-б да псавання бульбы. Прыйшлося разгружаць яго. Тады адміністрацыя падала вагон... з-пад газы. Часта падаюцца зусім нягодныя, не адрамантаваныя вагоны.

У **Астанкавічах**, Жлобінскага раёна падалі пад бульбу два вагоны з-пад цэменту. Дзяжурны па станцыі **Бараноўскі**, не гледзячы на забарону дыспетчэра, пад пагрозай штрафа за прастой, прымушаў адправіцеля загрузіць гэтыя вагоны. Патрабавалася ўмяшанне камерцыйнага аддзела, каб Бараноўскі адмовіўся ад свайго намера.

На лініі **Слуцак—Асіпавічы** маюць месца сустрэчныя перавозкі.

На нарадзе пры кіраўніцтве ўпаўнаважанага камітэту загатовак прадстаўнік НКШЗ т. **Хрыстафораў**, замест таго, каб завастрыць увагу на неабходнасць выразнай работы ўсіх арганізацый і транспарта ў першую чаргу, узяў пад сумненне рэальнасць планаў падачы вагонаў. Па думцы тав. Хрыстафорава, чыгункі змогуць падаваць штодзённа не больш 210 вагонаў у той час, як ужо цяпер што дзённа патрэбна не менш 600. Калі адгружаць такімі тэмпамі, як гэта прапануе Хрыстафораў, прыйшлося-б расцягнуць адгрузку аж да студзеня. Да гэтага часа яшчэ не прынята рашучых мер да паскарэння прасоўвання бульбы, шляхам маршрутызацыі цягнікоў. Маршрутызацыя-ж — гэта адно з мерапрыемстваў, якое-б дазволіла значна скараціць шлях следвання бульбы ў Ленінград на некалькі дзён.

### Перавыканалі верасняўскі план

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу).

Да 28 верасня адгружана Ленінграду 1.199 тон бульбы, або 101 проц. верасняўскага плана.

ЖУРАЎЛЁЎ, БАСКІН.

ПОЛАЦАК. (Па тэлеграфу).

Раён перавыканаў жнівеньска-верасняўскі план адгрузкі бульбы Ленінграду. Трэба было адгрузіць 2.065 тон, адпраўлена 2.075. Адгрузка ўзмацняецца з кожным днём.

ФРЫД.

УШАЧЫ. (Па тэлеграфу).

28 верасня перавыканана верасняўскае задание. Адпраўлена Ленінграду 709 тон. Колькасць загатоўленай і яшчэ неадпраўленай бульбы перавышае 300 тон.

КРОНЕНБЕРГ, ЛЯСОВІЧ, ВОЛКАЎ.

### ХОД АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ

(На 27 верасня ў тонах)

| 2-х месячны план | Адгружана: З пачатку кампаніі | Адгружана: За дзень | У проц. да 2-х месяч. плана | У процантах да гадав. плана |
|---|---|---|---|---|
| 108.000 | 42.678 | 7.465 | 39,5 | 15,8 |

### Сігнальныя пасты—на адгрузцы

**Бабруйск.** (Наш кар.). Раённы штаб «лёгкай кавалерыі» актыўна ўключыўся ў бульбапастаўкі. На прыёмачных пунктах усталёўлены пасты «лёгкай кавалерыі». У райшта бо дзяжурны цэлы дзень прымае данясенні пастоў і патрабуе рэагавання на іх сігналы.

У апошнія дні ў Бабруйску назіраўся вялікі наплыў бульбы. Абоз за абозам прыбываў у горад. Беспераперыўна ў райштабе званіў тэлефон. Першы трывожны сігнал прагучэў з **паста № 1:**

«Калгас імя Варашылава прывёз тры вазы мокрай бульбы, не хапае тары для разгрузкі вазоў, бульба ў вагоны не грузіцца. Пост № 1. **Дзядзюля і Сукалаў».**

Праз паўгадзіны зноў званок:

«Дана заяўка на 25 вагонаў. Ужо ёсць запас бульбы на 10 вагонаў. Ночу паданы толькі два вагоны, іх гружаю адзін, бо не хапае грузчыкаў. Пост № 2 на станцыі Бярэзіна — **Л. Цыркін».**

У 11 гадзін дня з першага паста паступіла данясенне:

«На прыстань вагонаў не даюць. Учора з Парыч у баржы прыбыло 150 тон, замест таго, каб яе грузіць у вагоны, бульбу ссыпаюць у склад, што зацягвае адгрузку. На базе райзага другі дзень стаіць недагружаны вагон таму, што заг. райбазы не ўжывае ніякіх мер».

Пост «лёгкай кавалерыі» на станцыі Бярэзіна і рэчнай прыстані піль на сочыць за ходам адгрузкі. Выяўлены нядбайныя адносіны станцыі да падачы вагонаў. Вагоны падаюцца неачышчанымі. 23 верасня былі паданы вагоны, раней занятыя вугалем, неачышчаныя ад гразі і пылу. На другі дзень падан вагон з-пад газы. Ці можна грузіць бульбу ў такія вагоны?

Або возьмем прыстань. Перагрузку бульбы з баржаў у вагоны робяць два электрычныя элеватары. Электра станцыя зрывае падачу тока. Элеватары прубяць адзін вагон дзве гадзіны, замест 45 мінут па норме.

Часта бульба падае з элеватара ў вяду і піне. Загадчык патрузачных аперацый **Зельдзін** не зварачае на гэта ўвагі.

Справы, выкрытыя пастамі «лёгкай кавалерыі», перададзены пракуратуры і РКК-РСІ, якія прынялі рад мер для ліквідацыі прарываў.

* * *

У Бабруйскім раёне ўборка ідзе вельмі павольна. У большасці сельсоветаў капанне не разгарнулася. У калгасе **«Чырвоная Пяса»** бульба даў но паспела, але яе не капаюць.

Раённыя арганізацыі не ведаюць сапраўднага становішча з уборкай. У райза няма ўліку колькі бульбы ўбра на па сектарах і сельсоветах.

П. АРЦ.

### 76 бульбакапалак ляжаць без справы

Магілеў павінен адгрузіць Ленінграду **11.000 тон.**

Аднак, у радзе сельсоветаў капанне бульбы яшчэ не разгарнулася. Нічога не зроблена для арганізацыі брыгад на час уборкі.

Дрэнны ход уборкі тармозіць адгрузку бульбы Ленінграду: за першыя дзве дэкады верасня адгружаны 42 тоны замест 4.200.

Для таго каб хутчэй скончыць капанне, трэба поўнасцю скарыстаць бульбакапалкі. Аднак, у большасці калгасаў не пераможаны антымеханізатарскія тэндэнцыі. Яны назіраюцца і ў райза. У раёне ёсць 76 бульбакапалак, аднак ні адна з іх не адрамантавана, не арганізован інструктаж, як карыстацца машынамі.

На складах Белсельснаба ляжаць незабраныя 31 бульбакапалка. Кіраўнікі райза і Белсельснаба абмежаваліся тым, што яшчэ 2 месяцы назад габінетным парадкам размеркавалі гэтыя бульбакапалкі, але нічога не зрабілі, каб калгасы забралі машыны.

Н. Н.

### Ад пракуратуры БССР

У радзе раёнаў парушаецца закон аб пастаўках бульбы дзяржаве, рабочым цэнтрам адгружаецца нядобраякасная гародніна, прыёмачныя пункты і склады не падрыхтаваны, бульба ад здатчыкаў прымаецца несваячасова.

Старшыня калгаса **Ясенка**, не здаўшы дзяржаве ні аднаго кіло, прадаў 2 тоны бульбы ЗРК добрушскай папяровай фабрыкі.

**Рагачоўская** райзагатканторa 4-га верасня адгрузіла са станцыі Рагачоў у Ленінград вагон гуркоў, пакрытых гнілістымі плямамі, жоўтых, прарослых, у дрэннай тары, у выніку гуркі ў дарозе пагнілі.

**Камарынская** загатоўчая кантора Белплодагародніны 8 верасня адправіла ў Ленінград вагон мокрай бульбы з 10 проц. брака.

**Смалявіцкая** загатоўчая кантора Белплодагародніны адправіла Ленінграду 1.185 кгр. гуркоў, брак якіх даходзіў да 60 проц. **Гомельская** кантора ЛСПО адправіла ў Ленінград 8.950 кгр. гуркоў з бракам у 28 проц. **Полацкая** кантора ЛСПО адправіла ў Ленінград гуркі з бракам у 25 проц.

Загадчык **Шклоўскага** райзага **Жыгоцкі** і старшыня райспажыўсаюза **Розін**, як сігналізавала «Звязда» ў нумары ад 25 верасня, не падрыхтавалі пункт для прыёмкі бульбы; адсутнічаюць таксіроўшчыкі і прыёмшчыкі, на пункце дапускаюцца вялікія чарні здатчыкаў бульбы, ёсць факты абважвання і апускання здатчыкаў.

Лічачы такія з'явішчы злачынными, прапануем:

— Пракурору Церахаўскага раёна тав. **Гэрэліку** па працягу 2-х дзён прыцягнуць да судовай адказнасці старшыню калгаса Церахаўка Мухіна і работнікаў Гомельскага ЗРК, вінаватых у тавараабмене. Таксама на працягу 2-х дзён арганізаваць судовы разгляд справы старшыні калгаса Ясенкі аб продажы бульбы добрушскаму ЗРК.

Пракурорам Рагачоўскага, Камарынскага, Смалявіцкага, Гомельскага, Полацкага і Шклоўскага раёнаў на працягу трох дзён расследаваць вышэйпаказаныя злачынныя факты адгрузкі Ленінграду нядобраякаснай бульбы, гуркоў, дапушчэння вялікай чарні пры прыёмцы бульбы, апускання і абважвання здатчыкаў.

Аб выкананні гэтага распараджэння пракурорам паведаміць мне.

Пракурор БССР КУЗЬМІН.

## МЭТА АРЫШТАЎ СОВЕЦКІХ СЛУЖАЧЫХ НА КУЧ—ЗАХВАТ ДАРОГІ ЯПОНА-МАНЧЖУРСКІМІ ЎЛАДАМІ

ХАБАРАЎСК, 25. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Харбіна, кіраўнік КУЧ тав. **РУДЫ** падпісаў у адпаведнасці з існуючым палажэннем загад аб часовым назначэнні замест арыштаваных начальнікаў служб старшых агентаў гэтых служб — совецкіх грамадзян.

Сёння раніцою манчжурскі памочнік кіраўніка дарогі Чжан Мін-чжэ заявіў т. Руду, што яму даручана катэгарычна патрабаваць назначэння на пасады арыштаваных начальнікаў служб і начальніка майстэрань у якасці ч. з. а. іх кітайскіх памочнікаў, а на пасаду старшага дыспетчара эксплаатацыі — кітайскага служачага, які нават не мае адносін да дыспетчарскай, прычым гэта патрабаванне матывуецца тым, што начальнікі служб не зволены, а арыштаваны і іх намесніцтва, якое носіць часовы характар, павінна быць даручана іх кітайскім памочнікам.

Тав. Руды адказаў, што ён дзейнічае ў адпаведнасці з існуючымі палажэннямі і на пасады совецкіх начальнікаў заўсёды назначаліся совецкія грамадзяне.

Чжан Мін-чжэ заявіў тав. Рудому, што за гэтым паследуюць далейшыя сур'ёзныя меры. Тав. Руды адказаў, што гэтыя патрэбы толькі пацвярджаюць планы ўлад, але пакуль ён кіраўнік КУЧ, ён будзе дзейнічаць у адпаведнасці з існуючымі палажэннямі.

Гэтымі дзеяннямі манчжуры адкрыта расшыфравалі прычыну арыштаў. Пры гэтым трэба адзначыць наступную характэрную рысу: кітайскі памочнік начальніка службы цяні ўжо сёння ў пачатку службовых заняткаў размясціўся ў кабінеце памочніка начальніка службы цяні. У замежных колах адзначаюць, што заява тав. Сакольнікава, якая была зроблена перад арыштамі, загадзя выкрыла правадзімыя мерапрыемствы.

Сёння генеральны консул СССР тав. **СЛАВУЦКІ** паведаў Сімамура і шаўтарыў катэгарычнае патрабаванне аб неадкладным вызваленні арыштаваных, настойваючы адначасова на пабачэнні з арыштаванымі для праверкі ўмоў, у якіх яны трымаюцца.

Тав. Славуцкі адзначыў, што спосаб дзеянняў манчжурскай часткі адміністрацыі КУЧ пацвярджае яго ўзарашные заяўленне Чы Люй-беню, што адзінай мэтаю арышта было — устарэніць начальнікаў службы совецкіх грамадзян, замяніўшы іх манчжурамі ў якасці спробы захвата дарогі.

* * *

ХАБАРАЎСК, 26. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Харбіна, сёння манчжурскі памочнік начальніка сл. цягі зноў заняў кабінет начальніка службы. На прапанову вярнуцца ў свой габінет для выканання абавязкаў ён заявіў, што лічыць сябе адказным намеснікам арыштаванага начальніка службы. Пры гэтым манчжурскі памочнік заявіў, што не прызнае назначэння старшага агента службы Левігіна часова выконваючым абавязкі, бо т. Руды не ўэгадніў гэта назначэнне з манчжурскім памочнікам кіраўніка.

Аналагічную лінію праводзіць і манчжурскі памочнік начальніка службы фінансаў, які патрабаваў да сябе назначанага ў якасці ч. в. а. новага начальніка і ў той-жа час адмовіўся выконваць распараджэнні апошняга.

Манчжурскі памочнік начальніка службы фінансаў прабаваў таксама адкрыць габінет начальніка фінансавай службы пры дапамозе слесара.

Паводле дакладных вестак, манчжурскім памочнікам прапанавана дэманстраціўна не падначальвацца распараджэнням новых совецкіх начальнікаў службы і распараджэнням кіраўніка дарогі ў частцы, якая адносіцца да гэтых новых назначэнняў.

### ПРЫПЫНЕННЕ ЛЕЙПЦЫГСКАГА ПРАЦЭСА НА ЧАТЫРЫ ДНІ

ВАРШАВА, 27.

У сувязі з адкрыццём 30-га верасня з'езда нацыянал-сацыялісцкіх юрыстаў, у Лейпцыг прыбывае каля 8 тысяч дэлегатаў з усёй краіны.

Лейпцыгскі трыбунал, згодна паведамлення польскага друку, пастанавіў прыпыніць судовы разгляд на чатыры дні, г. зн. з 29-га верасня па 2-е кастрычніка з тым, каб прадаставіць замежным журналістам магчымасць прысутнічаць на кангрэсе.

## ЧАРЛЬЗ ЛІНДБЕРГ УМАСКВЕ

МАСКВА, 28. (БЕЛТА). 28-га верасня палкоўнік **ЛІНДБЕРГ** з жонкаю наведалі Маскоўскі аўтамабільны завод імя Сталіна, дзе былі прыняты дырэктарам завода тав. **ЛІХАЧОВЫМ.** Госці на працягу 2-х гадзін аглядалі аспоўныя цэхі завода.

У той-жа дзень палкоўнік Ліндберг і яго жонка наведалі Большэўскую працкомуну імя АДПУ.

*ЧЫСТКА ПАРТЫІ*

# У сектары кадраў працуюць па-чыноўніцку

*(На чыстцы ячэйкі Наркамзема)*

Соцыялістычнае земляробства ва ўсю шырыню высунула пытанне аб кадрах. Патрэбны тысячы людзей, спецыяльна падрыхтаваных у розных галінах сельскай гаспадаркі, каб «дапамагчы калгаснікам весці сваю гаспадарку наперад, на аснове даных навукі і тэхнікі» (СТАЛІН). Падрыхтоўка кадраў — адна з важнейшых праблем у сістэме мерапрыемстваў партыі па ўзмацненні кіраўніцтва сельскай гаспадаркай і ажыццяўленні лозунга тав. Сталіна — зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі.

Велізарнейшае значэнне падрыхтоўкі кадраў для соцыялістычнай сельскай гаспадаркі ўлічвае і класавы вораг. Працяжная шкодніцкая дзейнасць прышчэпаўскага, нацдэмаўскага і эсэраўскагаахвосця ў апараце НКЗБ займала даволі шырокае месца і на гэтым участку. Падпарадкаваныя Наркамзему вышэйшыя навучальныя ўстановы і тэхнікумы аказаліся засмечанымі антысавецкімі элементамі, якія не толькі знаходзіліся ў ліку студэнтаў, але і займалі месцы выкладчыкаў. Многія з існуючых зараз тэхнікумаў па падрыхтоўцы спецыялістаў для сельскай гаспадаркі арганізаваны без уліку вытворча-вучэбнай базы, проста з разліку на зрыў работы У ГОРАЦКІМ с.-г. інстытуце звілі сабе гняздо буржуазныя нацыяналісты, эсэры, трацкісцкія і іншыя контр-рэвалюцыйныя элементы, якія даводзілі інстытут да развала. Чыстка парторганізацыі выкрыла гэта гняздо, ачысціла інстытут ад класава-варожых элементаў. Ужыты канкрэтныя захады для ўмацавання інстытута. За апошнія гады гэты інстытут не даў ні аднаго спецыяліста з закончанай вышэйшай адукацыяй. Узрастаючая патрэбнасць у кадрах для сельскай гаспадаркі не задавальнялася нават у самых мінімальных патрэбах.

Пасля таго, як было выкрыта шкодніцтва ў апараце Наркамзема, сектар кадраў умацавалі новымі работнікамі. Персанальная праверка комуністаў гэтага сектара (Сасінскі, Смірноў, Прокарэва, Лук'янскі, Пракопчык і інш.) паказала, што ўрокі мінулага не ўлічаны ў гэтай галіне работы. Кіраўнік сектара ПРАКОПЧЫК нават не ўдасужыўся падагуліць вынікі мінулага навучальнага года. Комуністы, кіруючыя работнікі сектара кадраў, не ведаюць асноўных кадраў у раёне, не ведаюць ні соцыяльнага склада студэнтаў тэхнікумаў, ні тавара выкладчыкаў.

З ліку выкладчыцкага склада навучальных устаноў вычысцілі 29 асоб, яўна класава-варожых элементаў, і на гэтым супакоіліся. За час сваёй работы ў сектары кадраў інспектар па тэхнікумах т. ПРОХАРАВА наведала толькі тры тэхнікумы (з 17-ці існуючых) і то не ў планавым парадку, а пераважна па сігналах аб непаладках там. Новы навучальны год пачаўся пры 73 проц. ўкамплектавання тэхнікумаў. У Курасоўскім тэхнікуме зусім сарвана камплектаванне першага курса.

Комуніст САСІНСКІ ведае размеркаванне кадраў. У сваёй рабоце ён не ўлічвае спецыялізацыі раёнаў, іх эканамічнага становішча і палітычнай важнасці, а кіруецца выключна прынцыпамі пасылкі аграномаў туды, куды яны хочуць ехаць.

Работа па падрыхтоўцы масавых кадраў ні ў якай меры не адпавядае прад'яўленым калгасным будаўніцтвам запатрабаваннях. За гэту работу непасрэдна адказвае комуніст СМІРНОЎ (агранам-эканаміст). Замест энергічнай арганізатарскай работы ён хныкае, што гэта галіна работы яму не падабаецца.

Пасобныя работнікі сектара кадраў апарат Наркамзема разумеюць, як месца адпачынку. З такімі настроямі паступіў нядаўна на работу ў сектар кадраў у якасці інспектара па масавых кадрах комуніст ЛУК'ЯНСКІ.

— Чаму вы, скончыўшы гідратэхнікум, не пайшлі працаваць па сваёй спецыяльнасці? — цікавяцца прысутныя.

— Здарылася гэта выпадкова, — адказвае Лук'янскі, — вярнуўшыся з арміі я зайшоў у Наркамзем пазваніць па тэлефону. Мяне спаткала т. Прохарава і даведаўшыся, што я нідзе пакуль што не працую, ухапіла за руку і пацягнула да Пракопчыка. А Пракопчык за руку — ды ў сектар кадраў ЦК. Так і аформілі справу.

— І ніхто не цікавіўся вашай спецыяльнасцю?

Лук'янскі замяўся.

Тав. Прохарава, маўклівa выслухоўваючы ўвесь час не зусім праўдзівыя разважанні Лук'янава аб «тэхніцы» паступлення на работу ў Наркамзем, нарэшце, заявіла:

— Тав. Лук'янаў не сказаў з большэвіцкай адкрытасцю аб сутнасці справы. Без усякіх «выпадкаў», ён прышоў да нас і заявіў, што хоча папрацаваць на больш-менш спакойнай рабоце...

Такая логіка спраў: «Хочаш адпачыць, — ідзі ў сектар кадраў Наркамзема». І людзі, мякка кажучы, пітэральна адпачываюць. Загадчык сектара Пракопчык, працуючы ў апараце Наркамзема, адчувае сябе «часовым госцем». Ён усякімі спосабамі імкнецца пазбавіцца гэтай работы, а пакуль знаходзіцца тут, пры ўсякім зручным выпадку ўвільвае ад адказнасці, калі паўстае сур'ёзнае пытанне ў сектары, якое патрабуе глыбокай прапрацоўкі і вырашэння.

Пытанні работы сектара кадраў два разы абмяркоўваліся на бюро ячэйкі і кадаўна стаяла пытанне на агульным партсходзе. Але ўказанні ячэйкі аб разгортванні работы засталіся толькі запісамі на паперы. НА ГЭТАЙ РАБОЦЕ ПРАКОПЧЫК ПРАЯВІЎ СЯБЕ НЕ ЯК БОЛЬШЭВІК, ХВАРЭЮЧЫ ЗА ДАРУЧАНУЮ ПАРТЫЯЙ СПРАВУ, А ЯК БЕСТУРБОТНЫ КАНЦЫЛЯРСКІ ЧЫНОЎНІК.

Ці выпадкова гэта?

Зазірнем у мінулае:

У апарат Наркамзема Пракопчык прышоў у маі месяцы з саўгаснага навукова-даследчага інстытута. Там ён працаваў амаль год у якасці дырэктара.

Баланс? Прышоў на работу — застаў 10 чалавек, за час свайго знаходжання там давёў штат да 52-х. Ён сам сабе вызначыў стаўку 500 руб. у месяц і яшчэ плюс 250 руб. ад НЕЗАКОННАГА прыстасавання пастановы ўрада аб дадатковай пенсіі за навуковую работу. І апрача ўсяго гэтага, за 10 месяцаў — 9.000 руб. перавыдатка па інстытуту!

За год існавання інстытута ледзь-ледзь «змайстравалі» тыповы сеазаварот у саўгасах і напісалі кнігу аб павышэнні ўраджайнасці. У гэтым і заключаецца ўся «навуковая» дзейнасць інстытута пад кіраўніцтвам Пракопчыка.

Зараз існаванне двух інстытутаў — саўгаснага і калгаснага — прызнана немэтазгодным. Інстытуты гэтыя зліваюцца. Напярэдадні адыхода з інстытута Пракопчык схадайнічаў сабе адпачынак. Не гледзячы на тое, што даны тав. БЕНЕКАМ дазвол на адпачынак адпадаў у сувязі з паступіўшым у хуткім часе распараджэннем аб забароне адпачынкаў для работнікаў с.-г. Пракопчык усё-ж выпісае сабе 1.500 р. з разліку 2-хмесячнага адпачынку, і перайшоўшы на работу ў Наркамзем за самааплочаныя ўжо месяцы зноў атрым ліве па пасадзе загадчыка сектара кадраў па 350 руб. у месяц.

Да работы ў інстытуце Пракопчык шэсць год вучыўся ў БДУ і ХАРКАЎСКІМ інстытуце чырвонай прафесуры.

Як-жа Пракопчык выкарыстаў набытыя веды для барацьбы за генеральную лінію партыі? Як ён змагаўся супроць правых апартуністаў, буржуазных нацыяналістаў, шкодніцкіх контр-рэвалюцыйных элементаў?

Адказваючы на гэтыя пытанні, Пракопчык прымае позу «артадокса», аддзяваецца агульнымі фразамі, не прыводзячы ні аднаго пераканаўчага факта. Ён вымярае гэту барацьбу напісанымі артыкуламі. 20 артыкулаў напісаў за тры гады. — хваліцца Пракопчык.

А каштоўнасць іх? Многія з гэтых артыкулаў зусім не ўбачылі света і, гэта магчыма з лепшаму. Артыкул яго аб арганізацыі працы ў калгасах, змешчаны ў «БОЛЬШЭВІКУ БЕЛАРУСІ» (1930 год, № 6-7), раскрэсь прасякнуты праваапартуністычнымі ўстаноўкамі. Ва ўгоду кулаку Пракопчык даваў парады працавць у калгасе мужчынам 160 дзён у год, жанчынам — 100, астатні-ж час ён аддаваў для працы ва ўласнай гаспадарцы. І зараз на чыстцы гэту справу Пракопчык імкнецца выдаць за выпадковыя памылкі, старанна выкручваючыся ад іх палітычнай кваліфікацыі.

Разюмуючы ход індывідуальнай праверкі Пракопчыка і яго нявартыя большэвіка выкруты ад фактаў, старшыня праверкома тав. НІЗАЎЦОЎ вельмі трапна і правільна адзначыў, што ГЭТЫ АРТЫКУЛ ПРАКОПЧЫК ПІСАЎ, ЯК АПАРТУНІСТ І АПАРТУНІСТЫ ЯГО ПРАПУСЦІЛІ ПРАЗ КАФЕДРУ І Ў ЧАСОПІСЬ.

Апошні аргумент Пракопчык выцягнуў са свайго партфеля:

«Пад ленінскім кіраўніцтвам тав. Пракопчыка наш калгас дасягнуў...»

Гэтай пісулькай ён запасся на ўсякі выпадак на Украіне, калі выязджаў з харкаўскага інстытута на некалькі дзён у калгас.

Бясспрэчна, пісулька Пракопчыку патрэбна. Збанкрутаваныя чыноўнікі з партыйнымі білетамі ў кішэні і апартуністы заўсёды карыстаюцца метадамі самастрахоўкі.

Я. Ів.

# ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ КАЛГАСЫ МОЦНЫМ ПАРТЫЙНЫМ КІРАЎНІЦТВАМ

Пачатак перабудовы партработы ў Шклоўскім раёне адносіцца да першых дзён жніўня, калі пачаў разгортвацца сваю дзейнасць палітаддзел МТС. Прайшло паўтара месяца, і да куставых парад па перабудове партыйнай работы па вёсцы, якія зараз складаюцца, ужо можна падвесці некаторыя папярэднія вынікі нашай работы ў гэтай галіне.

МТС абслугоўвае 11 сельсоветаў, з 85 калгасамі і 2.478 гаспадаркамі. Партарганізацыя зоны МТС да перабудовы складалася з 7 сельсавецкіх тэрытарыяльных ячэек, 1 сельсавецкай кандыдацкай групы, 2-х калгасных ячэек і ячэйкі МТС; акрамя таго былі 22 комсамольскія ячэйкі. Пасля рэарганізацыі ёсць 2 сельсавецкія тэрытарыяльныя ячэйкі, 2 сельсавецкія кандыдацкія групы, 4 калгасныя ячэйкі, 2 калгасныя кандыдацкія групы, 15 парткомсамольскіх ядраў, 25 парторгаў, працуючых непасрэдна ў калгасах, і 30 парторгаў прымацаваных, 25 комсамольскіх ячэек і 12 комсамольскіх арганізатараў. Такім чынам парткіраўніцтвам забяспечаны 76 калгасаў, 9 калгасаў засталіся без комуністаў і комсамольцаў.

Тыя ячэйкі, якія зразумелі сутнасць дырэктывы партыі аб перабудове партмасавай работы, якія непасрэдна заняліся пытаннямі вытворчай дзейнасці калгасаў, здолелі да сяўнуць немалых поспехаў у рабоце. Парторг Марозаў (калгас «Новы быт», Александрыйскага сельсавета) за кароткі час здолеў з дапамогай палітаддзела скалаціць у калгасе актыў ударнікаў і выкрыць шкодніцкую шайку, якая на працягу трох год не давала калгасу ўмацавацца, падрывала яго з сярэдзіны.

Парторг тав. Трапер (рабочы друкарні) правёў у калгасе «Шлях соцыялізма», Рыжкоўскага сельсавета, вялікую работу па мабілізацыі калгаснікаў на кругласутачную ўборку і абмалот. Ён добра ведае калгаснікаў, ведае як кожны з іх працуе.

У калгасе «Перамога», Аляксеёўскага сельсавета, створана кандыдацкая група з 2-х членаў і 2-х кандыдатаў партыі.

Комуністы ў брыгадах арганізавалі падвойнае перабленне селекцыйнага ільну з плошчы ў 100 гектараў. Калгас заключыў дагавор з навукова-даследчым інстытутам на ўдзячнае калгаснікаў у навукова-даследчую работу па вывучэнні новага спосаба халоднай дажджавой мочкі ільну. Кандыдацкая група разам з праўленнем калгаса вылучыла 20 ударнікаў для правядзення вопытаў на шклоўскім ільназаводзе.

Прыведзеныя прыклады паказваюць, што там, дзе партработа перабудавана паводле вытворчага прынцыпа, дзе комуністы ўваходзяць ва ўсе пробліэі калгаснай вытворчасці,— можна дасягнуць адчувальных розультатаў.

Гэтага палажэння многія комуністы, на жаль, яшчэ не зразумелі. На сходзе ячэйкі МТС, які, між іншым, не склікаўся 6 месяцаў, было адзначана, што сельсоветы зоны МТС не толькі не ідуць упераадзе па раёну па выкананні гаспадарча-палітычных задач, але па некаторых галінах нават і адстаюць. Прычына ў тым, што з боку рада комуністаў і раённых арганізацый назіраецца недаацэнка і нават ігнараванне дырэктывы партыі аб перабудове партыйнай работы.

Да апошняга часу існаваў інстытут упаўнаважаных РК і РВК, якія сядзелі ў сельсоветах і не ведалі, што робіцца ў калгасах. Усё гэта прыняло да рацу буйных прарываў у рабоце. У калгасах Александрыйскага сельсавета дапускаліся масавыя скажэнні лініі партыі ў практыцы аваназавання калгаснікаў. Чорнаручанскі сельсавет увесь час знаходзіцца на апошнім месцы.

Кулацтву ўдалося разгарнуць агітацыю супроць натураплаты МТС. У раёне выпустанылі палітычную сутнасць натураплаты, лічаць, што за гэту справу адказваюць толькі МТС і палітаддзельцы. Некаторыя раённыя адказныя работнікі, прымыцаваныя да 23-х калгасаў у якасці партарганізатараў, не растлумачылі калгасам, што натураплата МТС мае моц закона і павінна праводзіцца любач са збожжапастаўкамі. На 20 верасня натураплата выканана толькі на 18 проц. гадавога плана, але гэта нікога з раённых арганізацый не турбуе. Да гэтага часу не прынятыя да адказнасці работнікі Загатзбожжа за механічнае пераліўнае натураплаты ў лік дзяржпаставак з мэтай узняць іх процант.

Шклоўскі раён адстае ў выкананні сельска-гаспадарчых работ. Раён страціў пераходны сцяг, заваяваны ў часе веснавой пасеўкампаніі. Неабходна было вынесці адсюль адпаведны палітычны ўрок, па-большэвіцку ўзяцца за перабудову партмасавай работы, пераканаць партыйны актыў з раённага цэнтра ў калгасы як на пастаянную работу, так і часова, на 3-4 месяцы ў якасці партарганізатараў. На справе-ж райком партыі абмежаваўся пасылкай аднаго таварыша па тры месяцы, 6—на пастаянную работу і 21 таварыша з партыйнага актыва прымацаваў да калгасаў. З 6-ці накіраваных на пастаянную работу двое былі вызвалены па «хваробе». Мабілізаваны на тры месяцы таварыш не быў вызвалены ад сваёй асноўнай работы ў раёне, а з ліку 21 партпрымацаванага да калгасаў здавальняюча працуюць толькі 3 парторгі (т. т. Герпман, Трапер і Крупская), а астатнія парашылі, што паколькі іх вызвалілі, як упаўнаважаных, дык у калгасы ехаць не трэба. Большасць партпрымацаваных на ват не пажадала з'явіцца на нараду, скліканую палітаддзелам і райкомам партыі па пытанні аб задачах парторгаў у калгасах.

Ці не ясна, што партыйная работа, формы і метады яе ў большасці калгасаў Шклоўскага раёна перабудаваны фармальна і што райкому КП(б)Б і палітаддзелу МТС неабходна забяспечыць калгасы сапраўды моцным партыйным кіраўніцтвам, па сутнасці рэалізаваць дырэктывы партыі аб перабудове партработы на вёсцы?

Нам. пач. палітаддзела
Шклоўскай МТС
**Просмушкін.**

Пампач па камсамолу **Казлоў.**

**Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што РАЗГЛЯД АПЕЛЯЦЫЙ НА ПАСТАНОВУ ЖЫТКАВІЦКАЙ РАЕННАЙ КАМІСІІ** па чыстцы, адбудзецца 2-3 кастрычніка ў Жыткавічах (памяшканне РКК).

Разгляд апеляцый на пастанову ТУРАЎСКАЙ раённай камісіі па чыстцы адбудзецца 4-га кастрычніка ў Тураве (памяшканне РКК).

РЭСПУБЛІК. КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

УСЕБЕЛАРУСКІ ПАХОД ЗА ВЫСОКАЯКАСНУЮ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛЮ

# САЎГАСАМІ ЗАСІЛАСАВАНА УСЯГО 25.951 ТОНА, АБО 25,4 ПРОЦ. ПЛАНА

## УСЕ СІЛЫ НА ЗАВЯРШЭННЕ ПЛАНА СІЛАСАВАННЯ!

Толькі створэннем фондаў сакавітых кармоў праз сіласаванне саўгасы змогуць поўнасцю забяспечыць усё паголоўе кармамі. Толькі сіласаваннем мы можам папрадзіць змяншэнне паголоўя і зніжэнне ўдойлівасці кароў вясною.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у пастанове аб уборцы, загатоўцы і адгрузцы бульбы Ленінграду котэдэчычна папярэдзілі дырэктараў саўгасаў, што навыкарыстанне ўсяго бульбяніка на сілас будзе разглядацца, як зрыў дырэктыў па стварэнню кармовай базы.

Адным бульбяніком саўгасы могуць забяспечыць сябе сіласнай масай на 36 проц. усёй патрэбнасці. І нагэтуль саўгасы забяспечаны сіласнай масай больш, чым гэта ім патрэбна для выканання плана. Як-жа выконваюць саўгасы план сіласавання?

Большасць саўгасаў БССР план сіласавання сарвалі. Урокі мінулага года не ўлічаны. Возьмем саўгас РУЖАМПОЛЬ Менскага Малакапрэмтрэста, дзе летась быў сарваны план сіласавання. План здачы малака, масла і мяса сарваны. Каровы худыя, ледзь ногі цягнуць. Здаецца-б, што сёлета саўгас пасіўнем быў зварнуць асаблівую ўвагу на сілас, тым больш, што яму на хапіў нават і грубых кармоў. Але з пленавых 409 тон саўгас засілаваў толькі 30 тон. А саўгас САКОЛКІ, дзе ўвесну жывёла літаральна галадала, да выканання плана сіласавання ў 120 тон нават і не прыступіў.

Саўгас ГРУДЗІНАЎКА Віцебскага трэста, мае 408 штук жывёлы. Грубых кармоў яму не хапае. Ёсць вежа на 300 тон, ёсць і сілосныя ямы. Аднак, з 700 тон у саўгасе засілавана толькі 60.

Яўна кулацкую, школніцкую агітацыю супроць сіласа вядзе тэхнічны персанал саўгаса «Абрубачысціх», Віцебскага трэста. У саўгасе ёсць і вежа, і сілосная маса, але з 300 тон засілавана толькі 60, бо «кам, — кажа апранок, — сілас непатрэбен».

Чым, як не кулацкім сабатажам сіласавання, можна тлумачыць, што рад саўгасоў і не пачынаў яшчэ сіласавання? Гэта — ПОКРЫШАВА, ПЯТРОЛІНА, ЗАМОШША, ЗАБЕГІ — Менскага трэста, ВІДОКІ, ЗАГАРАНЫ — Віцебскага трэста, УСЦЕ — Аршанскага трэста.

Поруч з гэтым мы маем шматлікія факты злачынлівага пакідання сіласнай масы. Кулацкія элементы, вядучыя агітацыю супроць стварэння кармовай базы для соцыялістычнай жывёлагадоўлі, нішчаць сіласныя культуры, псуюць сіласную мабу.

У саўгасе ВЯЛІКІЯ НАВАСЁЛКІ скошаны з 7-мі га спаначнік ляжаў нескасаваны і, урэшце, высах так, што ім зараз толькі печы топіць можна. У саўгасе РАЧКАВІЧЫ бацвінне ад турнэпса на 75 проц. пакінута.

Уся гэта дзейнасць клясовага ворага застаецца беспакаранай.

Большасць саўгасаў не ўлічваюць пагрозы, якая стварэцца ў сувязі са зрывам плана сіласавання. Патрэбен рашучы пералом. Ва ўсіх саўгасах пасіўны быць адразу выпучаны спецыяльныя сіласныя брыгады. 15.000 га бульбы, засеяной у саўгасах, дадуць не менш 30.000 тон сакавітага бульбяніка для сіласа. Пастанова ЦК і СНК аб сіласаванні ўсёй гэтай масы павінна быць выканана.

Невыкананне плана сіласавання павінна разглядацца, як зрыў кармовай базы, як зрыў паходу за высокаякасную соцыялістычную жывёлагадоўлю.

# Пастанова сакратарыята ГК КП(б)Б і гарадской камісіі па чыстцы ад 27 верасня 1933 г.

1. Заслухаўшы паведамленне камісіі па чыстцы парткалектыва службы заслаатаны аб меўшым месца фашыставаннем дробна-буржуазнага, разбе пчалага, мяшчанскага, па сутнасці кулацка-варожага антыпартыйнага выступлення над кіраўніцтвам выключаных з партыі Чэркаскага і Кроліка супроць камісіі па чыстцы некаторых работнікаў буфета, якія паставілі сабе мэтай скампрэметаваць палітычнае значэнне чысткі, каб пад відам неўгледнення з выкладкі камісіі па чыстцы прыкрыць антыдзяржаўныя ўчынкі, бытавое разлажэнне, сабатаж пастаноў ЦК і СНК аб перабудове работы на транспарце.

2. Гэты факт змог мець месца таму, што да гэтага часу на асобных участках транспарта не разгорнута сапраўдная большэвіцкая самакрытыка, каштоўныя ініцыятывы не выкрыты, не ажыта сямейнасць і круговая парука. Невытрачальна ўзнята партыйная піль насць па барацьбу з сабатажнікамі, шкодніцкімі, класава-чужымі элементамі, якія зрываюць пастановы ЦК і СНК аб рабоце транспарта.

Гэта пацвярджаецца яшчэ і тым, што гэты факт класава-варожага выступлення прапаў мімо парткалектыва, і група Чэркаскага не атрымала адпаведнага палітычнага адпора з боку большасці прысутнічаўшых комуністаў на выніках чысткі і гэта група не выкрыта, як яўна-варожая партыі і рабочаму класу.

3. Само парткіраўніцтва ў асобе сакратара парткалектыва т. Майсака не ўлічыла палітычнага сэнсу варожага выступлення Чэркаскага, абмежаваўшы ся сцэнай выступленнем супроць гэтай групы, не давяўшы аб гэтым да ведама ГК КП(б)Б.

Выходзячы з гэтага сакратарыят ГК КП(б)Б і гарадская камісія па чыстцы пастанаўляюць:

1. Прымаючы пад увагу тое, што чыстка парткалектыва не ўскрыла да канца ўсё чужое, гніла-разлажыўшаеся ў радах партарганізацыі, што яшчэ засталося такія, якія канчаткова страцілі партыйную і класава-рэвалюцыйную пільнасць, лічыць неабходным паўторна правесці ў асобных комуністаў.

Даручыць ячэйковай камісіі па ўгледненню з гарадской камісіяй па чыстцы выявіць усіх комуністаў, якія падлягаюць паўторнай чыстцы.

2. У сувязі з тым, што бюро парткалектыва аказалася плядольным мабілізаваць партарганізацыю і пад яго кіраўніцтвам увесь парткалектыў супроць сабатажнікаў, лічыць неабходным па ўгледненню з палітаддзелам чыўнікі правесці перавыбары бюро парткалектыва.

3. Растлумачэнне пастановы ГК КП(б)Б і гарадской камісіі па чыстцы і арганізацыю агульных сходаў па службах чыгункі ўскласці на т. т. Горагляда, Скормана і Мінца.

4. З прычыны выключна палітычнага значэння факта меўшага месца на чыгунцы, — даручыць усім парткалектывам і ячэйкам абгаварыць пастанову гаркома. ГК і гарадская камісіі па чыстцы пад кутом значнага ўзмацнення партыйнай пільнасці комуністаў для мабілізацыі вакол палітычнага значэння і прынцыповай пастаноўкі чысткі партыі.

Сакратар Менгаркомэ КП(б)Б
КУДЗЕЛЬКА.

Нам. старшыні гаркамісіі па чыстцы ХАДАСЕВІЧ.

## Саўгасы — перадавікі сіласавання

ЗАСІЛАСАВАНА Ў ТОНАХ:

| | План | Выканана |
|---|---|---|
| ПІСАРАЎШЧЫНА | 285 | 324 |
| БЕЛІЦА | 465 | 225 |
| ГОРКІ | 900 | 600 |
| НАЧА-ШПАКОЎШЧЫНА | 200 | 140 |
| БРАНЧЫЦЫ | 350 | 200 |

## Саўгасы, зрываючыя план сіласавання

| | План | Выканана |
|---|---|---|
| ПАЧАЕВІЧЫ | 563 | 90 |
| «ПЕРАМОГА» | 600 | 75 |
| УСЦЕ | 575 | 0,0 |
| ВІДОКІ | 465 | 0,0 |
| ЗАГАРАНЫ | 360 | 0,0 |
| ДРЫБІНА | 250 | 0,0 |
| ДОЙНІЧАВА | 300 | 0,0 |

# ДАКЛАДНАЕ І НЯЎХІЛЬНАЕ ВЫКАНАННЕ ЎЗАЕМНЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПАМІЖ МТС І КАЛГАСАМІ — ЗАРУКА ДАЛЕЙШЫХ ПЕРАМОГ НА ФРОНЦЕ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА ЎМАЦАВАННЯ КАЛГАСАЎ

## ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА

Здача натураплаты МТС — важнейшая палітычна-гаспадарчая задача. Атрыманне МТС аплаты за сваю работу ў калгасах патурай у пэўных процантных адлічэннях ад ураджая абумоўлівае павышэнне зацікаўленасці МТС у паляпшэнні якасці апрацоўкі зямлі і ўзнаўлі ўраджайнасці. «Зразумела, што без такой аплаты дзяржава не магла-б утрымаць МТС, а МТС не маглі-б аказваць дапамогу калгасам» (з паст. СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб натураплаце).

Па БССР здача натураплаты праходзіць **зусім нездавальняюча.** На 25 верасня план здачы выканан **толькі на 24,7 проц.** Месячнае задание рэалізавана **ўсяго на 36,1 проц.**

Ва многіх раёнах яшчэ не ўразумелі і недаацэньваюць палітычна-гаспадарчай важнасці натураплаты. Так, па **Рэчыцкаму** раёну пры выкананні калгасамі і МТС задання па цвёрдых пастаўках на 100 проц., натураплаты здана толькі 16 проц.; па **Крупскаму** раёну адпаведна: 62 проц. і 10,4 проц.; па **Менскаму** — 79,7 проц. і 17 проц.; па **Крычаўскаму** — 82 проц. і 11,5 проц.; па **Чавускаму** — 66,8 проц. і 16,1 проц. і г. д.

Класавы вораг — кулак і яго агентура, улічваючы выключнае значэнне натураплаты ў справе ўмацавання калгаснай вытворчасці, усякімі мерамі імкнецца сарваць здачу натураплаты. У Крычаўскім раёне кулакі, шляхам распаўсюджвання розных правакацыйных чутак, вядуць актыўную агітацыю супроць натураплаты.

Неабходна зараз-жа прыняць самыя рашучыя меры для максімальнага ўзмацнення тэмпаў здачы натураплаты. Трэба цвёрда памятаць, што партыя і ўрад будуць меркаваць аб рэзультатах работы той ці іншай партарганізацыі, таго ці іншага комуніста не толькі па выкананні абавязацельстваў па цвёрдых пастаўках, але і па тэмпах і якасці здачы калгасамі натураплаты МТС.

Кулацкі сабатаж натураплаты трэба зламаць. План здачы натураплаты павінен быць выканан сваячасова кожным раёнам, кожным калгасам.

## НА РУКУ ВАРОЖЫМ ЭЛЕМЕНТАМ

КРЫЧАЎ. (Ад наш. карэсп.).

Пры выкананні калгасамі МТС 82,0 проц. гадавога плана збожжапаставак, натураплаты МТС паступіла толькі 11,5 проц. Такое адставанне выклікана далёка не аб'ектыўнымі абставінамі.

Шмат часу раённыя арганізацыі проста праспалі. Здача натураплаты пачалася з вялікім спазненнем. Толькі 20 жніўня паступілі першыя 4 цэнтнеры збожжа. Перад гэтым-жа ў раёне займаліся... заблытваннем пытання аб натураплаце.

Першым заблытаў справу дырэктар МТС тав. **Алхімаў.** Ён налічыў натураплату, выходзячы не толькі з фактычна зробленай работы (з тым, каб за далейшыя работы спаганяць аплату кожную пяцідзёнку), але ўключыў і тыя работы, якія ён толькі збіраўся правесці. Натуральна, гэтае налічэнне прышлося скасаваць і выпісваць калгасам новыя абавязацельствы.

Потым справу заблыталі той-жа тав. Алхімаў разам з райпаўнаважным камвзага тав. **Лупсковым.** Не ўлічыўшы работ, зробленых МТС увосень мінулага года пад сёлетні ўраджай (азімыя, зяблева), яны рад калгасаў абвясцілі не абслугоўваемымі МТС. Тав. Лупскоў выпісвае гэтым калгасам дадатковыя абавязацельствы па збожжапастаўках, а т. Алхімаў, адумаўшыся крыху пазней, налічае ім натураплату. Толькі дзякуючы ўмяшанню райкома партыі, вылучыўшага спецыяльную камісію, памылка была выпраўлена.

Усё гэта разам узятае грала на руку антыдзяржаўным элементам, якія арганізавалі сабатаж натураплаты. На калгасах была распушчана кулацкая хлусня, нібы збожжа, здаваемае ў лік натураплаты, пойдзе на харчаванне работнікаў МТС. Калі ватаўшчыкі МТС накіроўвалі абмалочанае збожжа ў лік натураплаты, кіраўнікі калгасаў спынялі возчыкаў і забаранялі здаваць натураплату. Так рабілі, напрыклад, у калгасе «Новае Сормава» старшыня калгаса **Кацзба** і парторг **Міхневіч.** Старшыня калгаса «Ленінскія дні» партыец **Кавылка** проста заявіў у прысутнасці калгаснікаў:

— Я не прасіў МТС, каб яна працавала, а таму зараз і не збіраюся ёй нічога даваць. Разлічуся з калгаснікамі, а калі будуць лішкі, здам штонебудзь і МТС.

Старшыня калгаса «Чырвоны араты» **Верамінаў,** зусім ясна гаворыць:

— Не ўнясу натураплаты, дык можа і так справа пройдзе.

Гэтыя кулацкія агенты зусім забылі, што дагавор з МТС мае сілу закона і што партыя і ўрад не дапусцяць ніякіх адхіленняў ад яго.

Пэўны націск райкома партыі, патрабаваўшага ад парт'ячэек і парторгаў арганізаваць здачу натураплаты адначасова са збожжапастаўкамі, даў некаторыя вынікі. Натураплата пачала паступаць. Калгас «Барацьбіт», Бацвінаўскага сельсавета (старшыня Ільянкоў) поўнасцю разлічыўся з МТС за работы, праведзеныя да 1 верасня і ўчёс ужо натураплату за работы ў верасні. Разлічыўся з МТС і калгас **«Краіна Савецкая»,** Паланіцкага сельсавета (старшыня Таратэйка); калгас **імя Сталіна** аплаціў 77 проц., **«Соцыялістычны шлях»** — 68,8 проц.

Але сабатаж натураплаты яшчэ канчаткова не зломлен. 14 калгасаў раёна дзейнасці МТС яшчэ не прыступілі да разліку з МТС за праведзеныя ў іх работы. Калгасы **«Звязда»** (Паланіцкага сельсавета) і **«Бязбожнік»** (Бацвінаўскага сельсавета), у якіх МТС працавала больш, чым у іншых калгасах (налічана звыш 10 тон), здалі зусім нязначную колькасць збожжа.

**Л. Бур.**

## АДСТАЛЫ ЎЧАСТАК

ЧАВУСЫ. (Наш карэспандэнт)

Спагнанне натураплаты за работу МТС у Чавускім раёне праходзіць зусім нездавальняюча. З 1.171,38 цэнт. вызначаных планам, на 20 верасня спагнана толькі 426,52 цэнтн., або 36,5 проц. Гэтыя лічбы — рэзультат бяздзейнасці раённых арганізацый, якія не аддаюць ніякай увагі спагнанню натураплаты і ў сваіх дырэктывах сельсоветам ні словам не упамінаюць пра гэта важнейшае пытанне.

Трэба проста сказаць, што натураплата МТС у раёне ігнаруецца.

Калгасы **імя Варашылава і «Ўдарнік»** (Прудкаўскага сельсавета), **«Пяцігодка», «Акцябр» і «Чырвоны барацьбіт»** (Антонаўскага сельсавета) за работу МТС **не здалі ні аднаго кіло збожжа.**

Абслугоўваемы МТС калгас **«Завет Ільіча»,** Галавенчыцкага сельсавета, катэгарычна адмовіўся ад малацьбы на складанай малатарні. Старшыня калгаса **Прусакоў** заяўляе:

— МТС трэба плаціць вялікую натураплату, лепш абыйдземся без складанай малатарні.

Прысутны пры гэтым упаўнаважаны РК **Манастырскі** замест таго, каб даць адпор гэтаму кулацкаму сабатажу і растлумачыць калгаснікам выгоднасць карыстання ўслугамі МТС, сам пачаў падтрымліваць кулацкія «довады» Прусакова.

У раёне ёсць выпадкі, калі натураплату залічваюць у абавязковую пастаўку (калгас «Новы шлях», Сушчэўскага сельсавета).

Зусім слаба разгорнута работа па спагнанні натураплаты на вытворчых участках МТС. Так, першы вытворчы ўчастак спагнаў натураплату толькі на 31,3 проц.

**П. С—коў.**

## Натураплату МТС залічваюць у цвёрдыя пастаўкі

ПОЛАЦАК. (Па тэлеграфу ад нашага карэспандэнта).

Калгасы Полацкай МТС — **«Акцябр», «Чырвоная горка», «Ленінскі шлях», імя Сталіна-2** выканалі поўнасцю план здачы збожжа дзяржаве.

Пры ўнясенні калгасамі натураплаты МТС прыёмачныя пункты залічваюць гэтае збожжа як цвёрдыя пастаўкі. Так, напрыклад, калгасу **«Акцябр»** 44 цэнтн. збожжа, зданых як натураплату, запісалі ў лік цвёрдых паставак.

Такіх выпадкаў шмат. Аб іх ведае загатчык райканторы загатзбожжа **Зельдзін,** але ніякіх мер не прымае.

**Фрыц.**

# ЗАКОНЧЫЦЬ ДАРОЖНАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў ТЭРМІН, ВЫЗНАЧАНЫ ПАРТЫЯЙ І ЎРАДАМ

## КАПЫЛЬСКІЯ ДЭКЛАРАТАРЫ

Прарабства 4 — адно з найбольш адсталых на участку АДПР-4. На прараб стве 4 яшчэ на сёнешні дзень засталося ўкладаць такелажам звыш 4,5 кілометраў дарогі, у той час, калі па ўсіх іншых прарабствах (за выключэннем 2-га, дзе патрэбна яшчэ ўкласці некалькі пікетаў) гэтая работа поўнасцю скончана.

Адной з апошніх прычын такога глыбокага прарыва з'яўляецца злачынная, бястурботнасць кіраўніцтва Капыльскага раёна да арганізацыі выхаду на дарогу пешай і конпай рабочай сілы.

Сакратар РК КП(б)Б т. Шпак і старшыня РВК т. Вайцэхоўскі абмяжоўваюцца толькі дакладнымі, абяцаннямі выканаць і пераканаць, «крутнуць» справу і г. д.

Чаго варта гэтыя абяцанні, паказваюць лічбы.

За ўсю першую палову верасня выхад рабочых на дарогу з большасці сельсоветаў раёна незначны.

Так, за два

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА

# ПРАВІЛЬНАЕ ТЭХНІЧНАЕ НАРМАВАННЕ— АСНОВА ПРАДУКЦЫЙНАЙ ПРАЦЫ УСІХ 7 ГАДЗ.

## З 7 толькі 4 прадукцыйныя гадзіны

Брыгада Даследчага інстытута арганізацыі і аховы працы выявіла цэлы рад недахопаў у скарыстанні рабочага дня на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце.

Масавыя фатаграфіі рабочага дня, якія праводзіліся на працягу некалькіх тыдняў над асноўнымі катэгорыямі рабочых у адным з буйных цэхаў—на біржы піламатэрыялаў—даюць наступны малюнак скарыстання рабочага часу: укладчыкі ў сярэднім шакавацць усяго 69 проц. карыснай загрузкі рабочага дня; бракеры і разборшчыцы толькі 60 проц.; тарцоўкі (адно з найбольш вузкіх месц на біржы) загружаны ў сярэднім на 53 проц. на працягу змены.

Гэта значыць, што мы фактычна маем велізарнейшую растрату працоўнага часу, чым больш недапушчальную для камбіната, які адчувае востры недахват рабочай сілы. Гэта значыць, што пры правільнай арганізацыі працы можна было-б абысціся без дадатковай рабочай сілы, належным чынам скарыстоўваючы велізарныя рэзервы.

Вось доволі тыповы малюнак рабочага дня укладчыкаў Гарунсіча і Кучынскага.

Працу пачалі замест 8 гадз. раніцы—у 6 гадзін 8 хвіл. Папрацаваўшы 1 гадз. 16 хвілін, зрабілі ў 9 гадз. 24 хвіліны перакурку на 12 хвілін. З 9 гадз. 36 хвілін працавалі да 10 гадз. 02 хв., а потым павінны былі спыніць працу з-за непадачы матэрыялаў, на что пашло 26 хвілін. Аднавілі працу ў 10 гадз. 28 хвілін, а ў 11 гадз. да рабочых падышоў начальнік участка і ўступіў у гутарку, якая цягнулася 10 мінут. Папрацаваўшы ўсяго 20 мінут (з 11 гадз. 13 мін. да 11 гадз. 33 мін.), рабочыя пайшлі абедаць. У сталоўцы замест 30 мінут яны прабылі 43 мінуты. Лішняя 13 мінут—з прычыны нікуды не вартай арганізацыі абслугоўвання рабочых у сталоўцы.

Пасля абеднёвага перапынку работа цягнулася 23 мінуты. З-за непадачы матэрыялаў да гэтага штабеля загадчык участка перакінуў рабочых на другое месца ўкладкі, на пераход страцілі 9 мінут. На новым месцы рабочыя папрацавалі ўсяго 13 мінут, пасля чаго селі і пагаварылі паміж сабой 7 мінут. Потым папрацаваўшы яшчэ 10 мінут, зноў спынілі ўкладку з-за непадачы матэрыялаў. Прасядзелі без работы да 1 гадз. 53 мін. дня, гэта значыць яшчэ 36 мінут. Падвезлі матэрыял, якога хапіла толькі на 17 мінут, пасля чаго праца зноў спынілася на 23 мінуты. Урэшце папрацавалі яшчэ 48 мінут і а 3 гадз. 23 мін., г. зн. за 7 мінут да гудка, праца зусім спынілася.

Усяго карысная працай у гэты дзень даная пара ўкладчыкаў была занята толькі 4 гадз. 25 мінут, або 63 проц. Прастоі з-за непадачы матэрыялаў, галоўным чынам, з-за дрэннай работы ўнутрызаводскага транспарта, складалі 21 проц. усяго рабочага дня. Позні пачатак рабочага дня, спазненне са сталоўкі, затэрміновае сканчэнне працы і г. д.—усё гэта каштуе даяржаве 1.000 руб.

Мы маем у Совецкім саюзе самы кароткі ва ўсім свеце 7-гадзінны рабочы дзень. Пролетарская даяржава і самі рабочыя маюць таму права патрабаваць ад рабочага і служачага, каб усе 7 гадзін ён працаваў добрасумленна, каб аддаваў даяржаве патрэбную для соцыялістычнай будоўлі сваю долю працы.

Калі падвесці вынікі ўсёй вялікай колькасці назіраванняў, якія зрабіў даследчы інстытут, дык мы атрымаем, што ўкладчыкі на біржы піламатэрыялаў Бабруйскага камбіната фактычна працуюць у сярэднім толькі 4 гадз. 50 мінут, брыгады бракераў—4 гадз. 12 мінут.

Прыблізна 60 проц. усіх прастояў выклікаецца галоўным чынам дрэнным становішчам унутрызаводскага транспарта. Пабудова вузкакалейкі ад лесацэха на біржу і па самой біржы замест зношаных і выбыўшых са строя аўтамашын і з'яўляецца некаторым крокам назад у сэнсе тэхнічнай дасканаласці (бо аўтавозы—больш перадавы сродак перасоўвання грузаў), але прадстаўляе ў сённяшніх умовах адзіны практычны выхад для камбіната.

Іншыя непрадукцыйныя страты рабочага часу можна і трэба ліквідаваць зараз-жа, бо гэта цалкам залежыць ад цэхавай адміністрацыі і ад самых рабочых.

Правільнае вызначэнне работы на ўвесь дзень, каб укладчыкі, браке́ры не трацілі часу на высвятленне, што ім рабіць; сваячасовая падача дапаможных матэрыялаў, выразная работа начальнікаў участкаў,—усё гэта не патрабуе ніякіх капітальных затрат і зусім лёгка можа быць дасягнута.

З другога боку, павінна быць узнята на вышэйшую ступень працдысцыпліна і самых рабочых. «Перакуркі» па 30—35 мінут, сяўленне за штабелем без справы, сістэматычнае спазненне на работу і сканчэнне яе раней тэрміна—ўсё гэта абыходзіцца штодзенна біржы і камбінату ў шмат соцень рабочых гадзін.

Задача адміністрацыі—дабіцца поўнага скарыстання рабочага часу. «Соцыялізм патрабуе не подвырнічання, а таго, каб усе людзі працавалі добрасумленна, працавалі не на іншых, не на багацеяў і эксплятатараў, а на сябе, на грамадства» (Сталін).

ТНВ камбіната пры дапамозе даследчай брыгады правяла значную работу па перагляду і ўдасканаленню норм выпрацоўкі на ручныя работы. У выніку больш поўнага скарыстання рабочага дня цэлы рад апрацый на біржы піламатэрыялаў ужо вельмі значны прырост прадукцыйнасці працы, у той час, як лік норм, які існаваў на біржы піламатэрыялаў, рэзка скараціўся (амаль у 4 разы). Перагледжаныя нормы і адзінкі вымера прадукцыйнасці працы ўстаноўлены такія, што яны вразумелы кожнаму рабочаму. Пры выразнай работе фахунковага апарата кожная брыгада і кожны рабочы мае магчымасць сёння-ж ведаць, колькі ён учора зарабіў.

Але гэта яшчэ першыя крокі. Задача ўсіх арганізацый камбіната — разгарнуць далей гэту работу, каб сапраўды працаваць усе 420 мінут працоўнага часу.

Э. КАРОН, Б. ГОЗМАН.

# МАШЫНА МАЯ ПРАЦУЕ БЕЗ ПЕРАБОЯУ

На панчошную фабрыку «КІМ» я паступіла пасля не пуска. Увесь час працую ў швейна-кацельным цэху.

Наш цэх, як і ўся фабрыка, знаходзіцца ў прарыве. Ужо не гаворачы аб тым, што сістэматычна не выконваюцца колькасныя паказчыкі, мы таксама даем вельмі дрэнную якасць прадукцыі.

Ці можам мы даваць добраякасную прадукцыю? На гэта пытанне я адказваю: так, можам! Гэта залежыць выключна ад нас самых, ад таго, як мы адносімся да сваёй работы.

Я вазьму прыклад з сваёй работы. Сваю норму ў 36 дзесяткаў пар панчох я штодзенна перавыконваю, даю не менш 38 дзесяткаў пар. Сёння, напрыклад, я дала 39 дзесяткаў пар. Брак з 2 проц. я давяла да 0,5 проц. За апошнія дні ў мяне брака зусім не было.

У тым, што я канчаткова знішчыла брак, нічога дзіўнага няма. Гэта—рэзультат таго, што я заўсёды стараўлюся ўважліва да сваёй работы. Я сачу, каб мая машына была заўсёды ў спраўнасці. Каб пачысціць машыну прыходжу на работу за 10-15 мінут да гудка. Пасля работы я таксама ў абавязковым парадку ўтвараю чыстку машыны. Мая машына працуе бесперабойна.

Для добраякаснай прадукцыі, без парэзаў з правільна адзетымі вуглямі, патрэбна заўсёды сачыць, каб панчоха была правільна адзета на такеля, каб не было пропуску. На гэта я звяртаю асаблівую ўвагу і таму мае панчохі ідуць у першы гатунак.

Нічога асаблівага няма і ў тым, што я перавыконваю сваю норму. Гэта рэзультат таго, што я працую прадукцыйна поўнасцю ўсе 7 гадзін. Калі мне што патрэбна—я звяртаюся да свайго брыгадзіра або інструктара, але сама працягваю шчыльна стаяць ля сваёй машыны. Ад работы ніколі не адрываюся.

Вось чаму я голасна заяўляю, што ўсякія спасыланні па розныя прычыны аб нерэальнасці нашага плана, аб немагчымасці яго выканаць—адна толькі хлусня.

Уся бяда ў тым, што ў нашым цэху ёсць значная колькасць бракаробаў, якія працуюць абыяк.

Хочу таксама адзначыць, што велізарная колькасць брака ёсць па віне адміністрацыі. Справа ў тым, што ў нашым цэху ёсць шмат малакваліфікаваных работніц, якія зусім нядаўна паступілі на фабрыку і патрабуюць яшчэ вучобы па аўладанню тэхнікай вытворчасці. Але наша адміністрацыя і цэхавая партыйная і прафсаюзная арганізацыі гэтым пытаннем не цікавяцца. У цэху нават няма тэхнічнага гуртка. Штодзенны інструктаж з боку брыгадзіраў і інструктароў таксама вельмі слабы. Наогул у цэху грамадская думка вакол барацьбы з бракам як належыць не мабілізавана. Ужо больш трох тыдняў, як не было вытворчай парады.

З ударнікамі ў нас работы ніякай не праводзіцца. Больш таго, ёсць шмат бракаробаў з ударнымі кніжкамі, як **Максімовіч Надзя, Вайцэхоўская Тамара** і інш. І наадварот, ёсць сапраўды добрыя ўдарнікі, як **Пятрова Ганна**, якая чамусці ўдарніцай не лічыцца.

Праходзячая зараз пераклічка павінна ўзняць барацьбу з бракам у нашым цэху на належную вышыню. А гэта будзе тады, калі цэхавыя арганізацыі ўзначаляць ініцыятыву рабочых і накіруюць яе на ліквідацыю прарыва.

Г. Новікава.
Ударніца фабрыкі «КІМ».



У Джанкоі (Крым) пасля сканчэння ўборкі ўраджая адбыўся вялікі калгасны кірмаш. Калгаснікі вывезлі для продажы гародніну, малочныя прадукты жывёлу. НА ЗДЫМКУ—Агульны выгляд кірмаша.

# Аб канвенцыйных бюро і вакханаліі цэн

Змешчаны ў «Правде» 17 верасня артыкул «Аб канвенцыйных бюро, якіх няма» зусім правільна адзначыў бядзейнасць канвенцыйных бюро большасці раёнаў БССР і тую вакханалію цэн, якая назіраецца пры правядзенні дэцэнтралізаваных загатовак сельгаспрадуктаў.

Факты, адзначаныя ў «Правде», і матэрыялы спецыяльнай праверкі, праведзенай даяржаўнай інспекцыяй цэн пры НК РСІ БССР, з выстарчальнай выразнасцю паказваюць на наяўнасць у некаторых звеннях кааперацыі і даяржгандля буржуазна-спекуляцыйных тэндэнцый пры закупках і рэалізацыі с-г прадукцыі.

Можам прывесці рад фактаў. Загадчык крамы № 7 Менгандлю па даговаранасці са старшынёй фабкома фа брыкі імя Фрунзе купляе на рынку жарову за 1.000 руб. і прадае рабочым фабрыкі мяса, па 9 р. 25 к. замест устаноўленай цаны на мяса вышэйшага гатунку ў 6 руб. за кілограм.

ЗРК «Камунарка» (старшыня Гурвіч) прадаваў рабочым свіное мяса па 11 руб. кгр. замест 7-мі.

Загадчык снабжэння ЗРК гуты імя Домбаля ў Барысаве груба парушыў канвенцыйныя цэны пры дэцэнтралізаваных загатоўках. У выніку ў магазінах ЗРК валоўе мяса прадавалася па 7 р. 42 к. замест 3 р. 75 к., сала—па 12 руб. замест 3 р. 75 к., масла па 18 руб. замест 12 руб. Такія-ж парушэнні цэн маюць месца ў ЗРК «Ком інтэрн» у Барысаве.

Выяўлен рад парушэнняў цэн і ў прадпрыемствах грамадзкага харчавання. Так, загадчык снабжэння сталоўкі Белзагатзбожжа загатовіў мяса па цэнах, у некалькі разоў перавышаючых канвенцыйныя: за целяціну ён плаціў па 9 руб. замест 3 р. 50 к., за свіное мяса на 15 руб. замест 4 р. 70 к., за валоўе мяса па 11 руб. замест 3 р. 85 к., за малако па 3 руб. замест 80 кап.

На працягу некалькіх тыдняў—у ліпені і жніўні месяцы—не былі ўстаноўлены цэны на плодагародніну. Гандлюючыя арганізацыі самавольна ўстанаўлялі загатоўчыя і продажныя цэны. ЗРК камбінату «Камінтэрн» у Барысаве загатовіў значную колькасць цыбулі па 1 р. 75 к. за кгр., замест устаноўленых 1 р. 19 к. МГРК прадаваў цыбулю-пяро па 1 руб. замест 85 к. кгр., памідоры па 30 кап. замест 22. ЗРК фабрык «Кастрычнік» і «Ўсходы» прадавалі гуркі па 65 кап. замест 33 кап.

Барысаўская база Белгандля ўвесь час загатаўляла яйкі па 3 р. 50 кап. дзесятак замест 3 руб. 30 кап.

На шмат якія прадукты дагэтуль няма канвенцыйных цэн. У сакавіку была вызначана цана на каўбасу ў 9 руб. кгр. Яна была самавольна скасавана членам прэзідыума БКС тав. Вербай, які чамусці назначыў спекуляцыйную цану ў 13 руб., на што канвенцыйныя бюро зусім не рэагавалі. Пасля гэтага былі зніжаны цэны на мяса, а цана на каўбасу не была ўстаноўлена і да апошняга часу.

Зусім адсутнічаюць канвенцыйныя цэны на такія прадукты, як сушаныя грыбы, павідла, варэнне, мёд.

Тут продажная раздробная цана самавольна ўстанаўліваецца кожнай гандлюючай арганізацыяй.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што канвенцыйныя бюро пры камітэце загатовак БССР і пры Наркамснабе БССР, а таксама райбюро не змагаюцца за правільную арганізацыю рабочага снабжэння і совецкага гандля, за совецкую палітыку цэн.

Ёсць выпадкі, калі канвенцыйныя цэны вызначаліся вышэй сярэдні-рыначных. У ліпені цана на гуркі была вызначана ў 25-30 кап. штука, у той час, калі на менскім, магілеўскім, гомельскім рынках можна было купіць гуркі па 15 і 20 кап.; канвенцыйная цана на радыску была вызначана ў 50 кап., а рыначная складала 30 кап. Такая работа канвенцыйных бюро на оправе спрыяла ўзмацнанню рыначных спекуляцыйных цэн.

Можна прывесці факты, калі загатоўчая цана перавышала продажную. У тым-жа ліпені канвенцыйнае бюро пры камітэце загатовак вызначыла загатоўчую цану на тварог 1 р. 50 к., а раздробная заставалася 1 р. 30 к. Такое становішча прыводзіла да грубейшага парушэння цэн. ЗРК шчотачнай фабрыкі па распаражэнні старшыні праўлення Матусевіча, прадаваў тварог па 2 р. і 2 р. 30 к. кгр., у выніку перабрана ў спажыўца 1.260 руб. ЗРК будаўнікоў прадаваў тварог па 1 р. 95 к. і 2 р. 20 к., перабраўшы 1.190 руб., па ЗРК завода імя Мяснікова спажыў цамі пераплачана 6.000 руб.

Судовыя органы мала ўвагі аддавалі барацьбе з парушэннямі совецкай палітыкі цэн, хаця закон разглядае гэтыя парушэнні, як злачынную спекуляцыю, як простае падтрыманне класа вага ворага.

Менская міжраённая інспекцыя цэн пры КК-РСІ яшчэ ў красавіку перадала менскай пракуратуры справу агента па загатоўках Наркамлёгпрама, які ў два разы перавышаў канвенцыйныя цэны на мяса. Гэта справа не разгледжана да апошняга часу. Таксама ў красавіку была перадана ў пракуратуру справа агента снабжэння шчотачнай фабрыкі імя Крупскай, які заплаціў у Пухавіцкім раёне за карову 1.800 руб. замест 780 руб. І гэта справа яшчэ не вырашана. Гарпракурор тав. Церахаў марыпаваў справу аб загатоўчыку пабудовы дома ўраду Кагане, які ў Капылі заплаціў за карову 1.500 р.

Поўную адказнасць за парушэнне цэн пры дэцэнтралізаваных загатоўках і за дрэнную работу райканвенцыйбюро нясуць райвыканкомы і райснабы, якія яшчэ мала ўвагі аддаюць пытанням совецкага гандля і совецкай палітыкі цэн. У прыватнасці Менскі гарснаб дапусціў перавышэнне раздробных канвенцыйных цэн у параўнанні з пэнамі, устаноўленымі Наркамснабам. Такія павы шаныя цэны даводзіліся да гандлюючых арганізацый.

Барацьба за далейшае зніжэнне цэн, за аздаравленне рынку, барацьба са спекуляцыйна-нэпмалокімі тэндэнцыямі з'яўляецца першачарговым абавязкам кожнага канвенцыйнага бюро, кожнай гандлюючай арганізацыі.

ШАУРОЎ.

*Апал пролетарскім цэнтрам*

# МОЦНА УДАРЫЦЬ ПА ЧЫНОЎНІКАХ, ЗРЫВАЮЧЫХ ЛЕСАВЫВАЗКУ

*(Агляд рабселькораўскіх лістоў)*

Месяц таму назад у Наркампрацы БССР з'явіўся калгаснік Шульга Якаў з калгаса «Лепшая доля» (вёска Хутары), Рэчыцкага раёна.

**— Упаўнаважаны я ад сялян вёскі Хутары, — сказаў Шульга, дастаючы з кішэні паперку. Вось тут напісана ўсё.**

Паперка, якую ён паклаў на стол, уяўляла сабою выпіску з пратакола агульнага схода сялян (калгаснікаў і аднаасобнікаў). Прыводзім яе змест:

**«СЛУХАЛІ: аб перамацаванні вёскі Хутары, КАКУЕВІЦКАГА сельсавета па рабоце па лесазагатоўках і вывазцы з Рэчыцкага леспрамгаса ў Парыцкі.**

**ПАРАШЫЛІ: прасіць Наркампрацы БССР замацаваць нашу вёску за Парыцкім леспрамгасам, з прычыны таго, што яна знаходзіцца на адлегласці не больш кілометра ад лесасекі Парыцкага леспрамгаса, а ў Рэчыцкім леспрамгасе нам працаваць нязручна, бо яго лесасекі ад нас знаходзяцца на адлегласці 35 кілометраў».**

Чым выклікана такая пастанова схода сялян, і чаму іменна калгаснік Шульга прывёз яе непасрэдна ў Наркампрацы? Адказ на гэта пытанне знаходзім у лісце рабселькора т. Малева.

**«Да 1933 года вёска Хутары, Рэчыцкага раёна, — піша ў сваім лісце т. Малеў, — заўсёды працавала на лесазагатоўках у Парыцкім леспрамгасе. Але сёлета кіраўнікам Рэчыцкага раёна чамусці ўздумалася прымацаваць яе да Рэчыцкага леспрамгаса, не лічачыся з тым, што лесасекі ад вёскі знаходзяцца на адлегласці 35 кілометраў».**

Што мелі на ўвазе рэчыцкія кіраўнікі, калі вырашалі гэта пытанне — для нас пакуль невядома. Але галавацяпская сутнасць такога вырашэння вельмі выразная. Справа не толькі ў тым, што такое галавацяпства прымусіла сялян пасылаць хадака ў Наркампрацы. Ні адна фурманка з вёскі Хутары ў лес яшчэ не выязджала: у Рэчыцкі леспрамгас не едуць таму, што далёка, а ў Парыцкі блізка, ды не маюць права, бо галавацяпы з Рэчыцы адабралі яго. І вось ужо цэлыя паўгода сяляне вёскі Хутары дабіваюцца аднаўлення гэтага права, пасылаюць упаўнаважаных у цэнтр, пішуць заявы ў **Лесбел.** Усюды абураюцца рэчыцкім галавацяпствам, усюды згодны аднавіць правы сялян вёскі Хутары. Але ўпартыя галавацяпы з Рэчыцы не адступаюць.

**— Вёска наша, — заяўляюць яны, — і павінна працаваць у нашым леспрамгасе!**

Прыходзіцца толькі здзіўляцца, да якога глупства людзі дайшлі! Што ім да таго, што дровы не вывозяцца? Для іх важны «тэрытарыяльны прынцып». Ці ведаюць рэчыцкія «прынцыпіялісты», што адсутнасць выстарчальнага запаса апалу пагражае спыненнем работы прадпрыемстваў? Напэўна не ведаюць, інакш яны-б не займаліся гульнёй у біруль кі, а мабілізавалі-б сваю ўвагу на фарсаванне лесавывазкі.

Аднак, рэчыцкія «прынцыпіялісты» ў пытаннях лесавывазкі не адзіныя. Падобных да іх можна знайсці і ў Лепельскім раёне. Там з лесавывазкай справа стаіць зусім дрэнна. У большасці сельсоветаў у лес не выязджала яшчэ ні адна фурманка, а ўпаўнаважаныя РК і РВК, праводзячы работу ў сельсоветах па ўборцы, збожжаздачы і асенняй сяўбе зусім не займаюцца пытаннямі лесавывазкі.

Рабселькор Касачоў у сваім лісце піша, што

**«Прадстаўнік Лепельскага РК і РВК тав. КУРКОЎСКІ на нарадзе комсамольцаў і комуністаў КРАСНА ЛУЦКАГА сельсавета, заваставшы ўвагу на ўзмацненні тэмпаў уборкі, збожжаздачы, сяўбы, мабілізацыі сродкаў, ні адным словам не абмовіўся аб лесавывазцы. І калі прараб участка леспрамгаса хацеў зрабіць заўвагу па пытаннях лесавывазкі, то Куркоўскі не дазволіў: «Я ВЕДАЮ, ШТО МНЕ РАБІЦЬ, І НІЯКІХ ЗАЎВАГ НЕ ПАТРЭБНА».**

Таксама прынцып, ды яшчэ які! Начальства, можна сказаць, прыехала «парадак наводзіць», а тут людзі лезуць са сваімі заўвагамі.

Нешта падобнае адбылося і ў **Чавускім** раёне. Там, як паведамляе рабселькор **П. К.**, 21 верасня склікалі раённую нараду старшынь сельсоветаў разам з сельскім актывам. На гэтай нарадзе гаварылі аб усім: аб уборцы, збожжаздачы, сяўбе. Але аб лесавывазцы ні слова. І нават калі знайшоўся адзін чалавек (прадстаўнік леспрамгаса) і хацеў сказаць, то старшыня РВК **АДАШЧУК** не дазволіў. Невядома, які ўжо тут прынцып? Напэўна той-жа самы: **начальства ведае, што робіць.**

У **Шклове** прытрымліваюцца зусім іншага прынцыпа. Рабселькор **КАЛАСОЎСКІ** піша, што кіраўнікі **Фашчыцкага, Высоцкага, Ардацкага і Гарадзішчанскага** сельсоветаў зусім нічога не робяць у галіне лесавывазкі. Яны лічаць, што **«лес і дровы возяць толькі зімой».** А таму «прынцыпова» не выконваюць дырэктывы СНК і ЦК КП(б)Б аб разгортванні двухдэкадніка па лесавывазцы.

# ПАБУДУЕМ ЭСКАДРЫЛЬЮ імя т. Кагановіча

## ЦСПСБ аб удзеле саюзаў у кампаніі пабудовы эскадрыльі

Прэзідыум ЦСПСБ у спецыяльнай пастанове прызнаў правільным зменчаны дэпіс у газеце «Звязда» ад 20 верасня, што ЦСПСБ (культмасавы аддзел), ЦК саюзаў сельгрэм, грамадскага харчавання, працаўсветы і іншыя недаацанілі важнасці кампаніі збору сродкаў на эскадрылью імя тав. Кагановіча. У выніку па раду саюзаў кампанія праходзіць самацёкам.

Прэзідыум ЦСПСБ абавязаў усе ЦК саюзаў, асабліва ЦК саюза працаўсветы, грамадскага харчавання, сельгрэм, РПС Барысава і Магілева забяспечыць канкрэтнае кіраўніцтва і дапамогу пізаўным прафарганізацыям па зборы сродкаў, шырока растлумачваючы важнасць і значэнне збора ў цэхах, брыгадах, сярод пастаўніцтва школ, ва ўстановах, падшэфных калгасах, сельсоветах і г. д. шляхам разгортвання соцспаборніцтва паміж прадпрыемствамі, раёнамі, скарыстаўшы вопыт перадавых.

## На бягучым рахунку—882.940 руб.

**За 28 верасня** на бягучы рахунак Дзяржбанку № 160-7814 паступіла толькі 1.889 руб. Ад устаноў і арганізацый Менска: гаркасы—395 руб., прызыўнога пункта—200 руб., партканцыі — 51 руб., Белрыбтрэста—21 руб., польскага петтэхнікума — 16 руб., сталоўкі НКЗ—15 руб. З раёнаў: **Крупскага**—1.131 руб. і **Полацкага**—58 руб.

**З пачатку збора на бягучым рахунку—882.940 руб.**

## Уносяць і выклікаюць

* Выклік кароспандэнта тав. **Л. Фрыца**, я, работнік родакцыі газеты «Звязда», прымаю. Уношу 25 руб. і выклікаю тав. **Сіткевіча** (ПШ АДПУ).

**ЮР. ТАКАРЧУК.**

* На выклік т. т. **Стальнова і Вальфсона** мы, работнікі ЦК ЛКСМБ, уносім па 15 руб. кожны на эскадрылью імя тав. Кагановіча. Выклікаем наследваць нашаму прыкладу т. т. **Каўнацкага, Зазена, Лебядзевіча, Люхцера, Кузнецова, Церэнцьева і Смоліхава.**

**ФРЫДМАН, АЖГІРЭЙ, ПЕШАС.**

* Калгаснікі калгаса «3 рашаючы», Крычаўскага раёна, унеслі на пабудову эскадрыльі імя тав. Кагановіча 200 руб.

* На пабудову эскадрыльі калгаснікі калгаса «Прагрэс» (Старобінскі раён) унеслі 150 руб. і выклікалі суседнія калгасы наследваць іх прыкладу.

* Работнікі кааперацыі і дзяржгандлю Старадарожскага раёна сабралі ў фонд пабудовы эскадрыльі 124 руб. Збор сродкаў працягваецца.

* Вучні яўрэйскай ШКМ (Старадарожскі раён) унеслі 92 руб. і выклікалі на соцспаборніцтва на зборы сродкаў у фонд эскадрыльі вучняў беларускай ШКМ.

* Настаўніцкі калектыў Чыжэвіцкай ШКМ унёс у фонд пабудовы эскадрыльі 70 руб. і выклікаў настаўніцкія калектывы Шапалеўскай і Прускай ШКМ.

# Марынаваць уклады ніхто не мае права

(Ліст настаўніка)

Працуючы ў 1932 г. настаўнікам **Рацкаўскай** школы, Калачоўскага сельсавета **(Лагойшчына)**, я з'яўляўся ўкладчыкам Лагойскай ашчадкасы № 22. Пасля сканчэння заняткаў у школе, не атрымаўшы ўклада, я паехаў у адпачынак да сваіх бацькоў у **Рудзенскі** сельсавет, Пухавіцкага раёна. Каб атрымаць уклад па месцы свайго адпачынку, я здаў ашчадную кніжку Рудзенскай ашчадкасе № 16 з просьбай аб пераводзе майго ўклада ў апошнюю. За тры месяцы прабывання ў Рудзенску я ўсё-ж не атрымаў свайго ўклада, бо яго не выслала Лагойская ашчадкаса.

Зараз я прызначан настаўнікам у **Цімкаўскую** школу К. Слабодскага сельсавета **(Барысаўшчына)**. Адсюль я паслаў некалькі лістоў па імя Лагойскай і Рудзенскай ашчадкас з просьбай адшукаць і перавесці ўклад на месцы маёй працы, адпак ні адказа на лісты, ні самога ўклада я не атрымаў і да сённяшняга дня.

**Кароткі Янка.**

**Ад рэдакцыі:** «Звязда» лічыць недапушчальнымі, чыноўніцка-бюракратычнымі адносіны Лагойскай і Рудзенскай ашчадкас да абслугоўвання ўкладчыкаў. Патрабуем ад кіраўніцтва ашчадкас БССР тэрміновых мер, якія-б забяспечылі хутчэйшы перавод укладаў Кароткага на месцы яго працы.

*А. Хацкевіч*

# ЗАДАЧЫ ФІНАНСАВАЙ РАБОТЫ IV-га КВАРТАЛА*)

Центральны камітэт КП(б)Б і СНК БССР сваёй пастановай даручылі агітасамаму аддзелу ЦК і Народнаму камісарыяту фінансаў склікаць раённыя і потым усебеларускі злёт ударнікаў фінансавага фронта для падагульвання большэвіцкай барацьбы за выкананне фінплана трэцяга квартала і вызначэння такіх мерапрыемстваў, якія-б забяспечылі асноўнае, добраякаснае і дэтэрміноване выкананне фінплана IV квартала.

Беларуская ССР, якая на працягу 2½ год з квартала ў квартал выконвала і перавыконвала план мабілізацыі сродкаў насельніцтва і план плацяжоў абагуленага сектара, з пачатку трэцяга квартала пачала адставаць і апынулася ў хвосце раду краёў, абласцей і саюзных рэспублік. За гэта мы мелі суровае напрадзжанне з боку народнага камісара фінансаў Саюза ССР тав. Грынько. Нас прыклана крытыкавалі і газеты «Известия» і «Экономическая жизнь».

Іменна ў гэты момант, у момант адставання наогул, у момант надзвычай дрэннай работы асобых раёнаў БССР дрэнная работа асобых раёнаў БССР уступіла ў соцспаборніцтва з Заходнімі вобласцю, а потым і ва ўсесаюзнае спаборніцтва на датэрміновае і найлепшае выкананне фінплана па ўсіх плацяжах.

Наш друк на чале са «Звяздой», совецкі, прафсаюзы, комсамольскія, грамадскія арганізацыі, рабочыя, калгаснікі-ўдарнікі фінфронта, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, узняліся сапраўды па-большэвіцку за справу мабілізацыі сродкаў на сельніцтва, за справу добраякаснага і датэрміноваго выканання фінплана і на аснове соцспаборніцтва — гэтага магутнага большэвіцкага вагара соцыялістычных перамог — на сённяшні дзень дабіліся значных поспехаў.

Соцыялістычнае спаборніцтва, якое ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва з'яўляецца надзвычай важным метадам у выкананні пастаўленых партыяй і совецкай уладай задач, забяспечыла нам перамогу і на фінансавым фронце. Найлепшыя людзі ў гісторыі чалавецтва — Маркс, Ленін, Сталін не раз падкрэслівалі важнейшую ролю соцыялістычнага спаборніцтва, як комуністычнага метада «будаўніцтва соцыялізма на аснове максімальнай актыўнасці мільёнаў мас працоўных».

Тав. Сталін на XVI-м з'ездзе партыі сказаў, што «сутнасць большэвіцкага наступлення заключаецца далей у тым, каб мабілізаваць максімум сродкаў на справу фінансавання нашай індустрыі, на справу фінансавання нашых саўгасаў і калгасаў».

Іменна семі рабочыя, калгаснікі, фінансавыя, совецкія і грамадзкія арганізацыі зразумелі гэтую сутнасць, зразумелі значэнне мабілізацыі сродкаў на сельніцтва, як большэвіцкага наступлення ці ў справе соцыялістычнага будаўніцтва, у справе пабудовы бясклассавага соцыялістычнага грамадства. На аснове ажыццяўлення другой большэвіцкай пяцігодкі мы пад кіраўніцтвам партыі і гэтым наступленні дабіліся большэвіцкіх перамог. У справу мабілізацыі сродкаў насельніцтва ўцягнуты сотні тысяч рабочых калгаснікаў і прасоўных совецкай Беларусі, якія сваім актыўным удзелам у фінансавай рабоце забяспечылі выкананне фінплана.

На 20 верасня 47 раёнаў з 75 выканалі і перавыканалі планы мабілізацыі сродкаў насельніцтва за 3-ці квартал і тым самым забяспечылі выкананне агульнага рэспубліканскага плана мабілізацыі сродкаў на 100,9 проц., абавязковых плацяжоў на 104,8 проц., добраахвотных 87,4 і плацяжоў з аграмаднаго сектара народнай гаспадаркі на 90 проц.

Раёны **Менскі і Слуцкі**, якія паказалі лепшую якасць працы па выкананні фінплана, намі высоўваюцца кандыдатамі на ўсесаюзную чырвоную дошку. Рад раёнаў, як Асвейскі, Рагачоўскі, Заслаўскі і інш. у ліку 47 паказалі на справе, як могуць большэвікі грамадскія арганізацыі, актывісты, удар нікі выконваць пастаўленыя партыяй і совецкай уладай задачы. Гэтыя раёны абіраны, даныя ЦК КП(б)Б і Ураду БССР, выказалі.

Разам з гэтым у выкананні фінплана 3-га квартала мы маем і значныя недахопы. Не ўсе раёны выканалі свае абавязкі. Рад раёнаў яшчэ знаходзіцца і да сёння на чорнай дошцы. Да гэтых раёнаў адносяцца: **Лоёўскі, Кармянскі, Бешэнковіцкі, Пралойскі, Уваравіцкі, Суражскі, Сенненскі, Жлобінскі, Дубровенскі, Клічаўскі і Талачынскі.** Гэтыя раёны не выканалі сваіх фінансавых абавязкаў перад партыяй і совецкай уладай і ганебна правальваюць выкананне плана 3-га квартала па ўсіх асноўных паказальніках.

Мы не выканалі план па якасных паказальніках. У нас адстае такая справа, як пазыка, рэалізацыя якой яшчэ не скончана па вёсцы і асабліва сярод аднаасобнікаў. Недавыканан па цэлым радзе раёнаў і план па ўкладах у ашчадкасы, а таксама па палявых накладненнях у кааперацыю. У справе правядзення сельгаспадатка ёсць рад недахопаў. У радзе мясцін няма выразнасці і жорсткасці ў правядзенні класавай падатковай палітыкі ў адносінах да кулака і да заможнай часткі аднаасобнай вёскі.

Наша падатковая палітыка ёсць класавая большэвіцкая палітыка. Таму мы павінны побач з прадастаўленнем велізарных ільгот беднякам, калгаснікам, працоўным аднаасобным гаспадаркам на ахуўбе культур, на разведзенні жывёлагадоўлі і г. д. выяўляць і абкладаць у індывідуальным парадку кулацкія эксплаататарскія гаспадаркі, якія злосна зрываюць сяўбу і даяржаўныя абавязкі, гаспадаркі спекулянтаў і перакупшчыкоў сельгаспрадуктаў.

Ёсць у нас і на сённяшні дзень такія раёны, якія «не знайшлі» ні аднаго кулака ў вёсцы. Да такіх раёнаў адносяцца Бешанковіцкі, Клімавіцкі, Лоёўскі, Пралойскі, Тураўскі, Уваравіцкі і Чашніцкі. Гэтыя раёны не выявілі ні адной кулацкай гаспадаркі. Ударнікі фінансавага фронта паказаных раёнаў, якія зрыўстрічаюць на гэтым злёце, павінны добра ведаць, што ў гэтых раёнах ёсць кулацкія эксплаататарскія гаспадаркі, ёсць гаспадаркі, якія злосна зрываюць планы сяўбы, не выконваюць даяржаўных абавязкаў, ёсць гаспадаркі, якія займаюцца спекуляцыяй, перакупкай і перапродажам сельгаспрадуктаў. Але яны не выяўлены.

Прычына — адсутнасць у совецкіх арганізацыях і перш за ўсё у фінорганаў гэтых раёнаў належнай большэвіцкай класавай пільнасці ў справе выяўлення і абкладання ў індывідуальным парадку кулацкіх гаспадарак.

ЦК КП(б)Б, СНК БССР і НКФ не раз паказвалі, як трэба выяўляць кулацкія гаспадаркі, кага трэба абкладаць у індывідуальным парадку, як не трэба дапускаць перагібаў у адносінах да сапраўды працоўных гаспадарак. Гэтыя дырэктывы трэба ўважліва і паболшэвіцку выразна выконваць в тым, каб не парушаць революцыйнай законнасці і разам з тым не аслабляць нашай класавай падатковай палітыкі.

У нас яшчэ невыстарчальна выразна праводзіцца ўлік якасці фінансавай работы. Мы маем шмат выпадкаў дрэннага ўліку аб'ектаў абкладання па сельгаспадатку. Маюцца факты ўтойвання нагат калгасамі і калгаснікамі жывёлы, ёсць непоўны ўлік раллі. Усё гэта з'яўляецца мінусам у нашай фінансавай рабоце, на фронце падатковай палітыкі

## ЛЕЙПЦЫГСКІ ПРАЦЭС

# ФАШЫСЦКАЯ ІНСЦЭНІРОУКА ПРАВАЛІЛАСЯ

## ПАЛІЦЭЙСКІЯ У ЯКАСЦІ „СВЕДАК"

БЕРЛІН, 27. (БЕЛТА).

З сёняшняга дня судовае следства на лейпцыгскім працэсе вядзецца па «новай працэдуры», якая заключаецца ў тым, што замест Ван дэр-Люббе даюць паказанні паліцэйскі камісар і суд вы следчы, якія дапытвалі Ван дэр-Люббе на папярэднім следстве. Само сабой зразумела, што паказанні гэтых «сведак» цалкам супадаюць са складзенымі імі пратаколамі «допытаў» Ван дэр-Люббе.

Суд перайшоў да допыта паліцэйска га камісара Гейзіга, які з пачатку працэса расказваў аб тым, што нібыта тавары яму Ван дэр-Люббе пры першых допытах. У прыватнасці, прокурор Вернер просіць Гейзіга яшчэ раз прывесці даныя аб палітычным твары Ван дэр-Люббе. Паводле слоў «Ахт ур абенблат-Гейзіг дае наступны адказ: «Ван дэр-Люббе зрабіў найлепшую заяву наконт таго, што існуючы лад павінен быць заменен іншым—шляхам пераворота—і выказаў тэндэнцыі, якія можна знайсці ў праграме германскай компартыі». Паводле слоў «Нахт аўсгабе», Гейзіг заявіў аб тым, што «ён не можа дакладна сказаць, якія адказы даваў яму Ван дэр-Люббе на пытанне аб яго палітычных установах».

Далей абаронца Торглера Зак просіць сведку расказаць аб вочнай стаўцы Торглера і Ван дэр-Люббе. «Як Ван дэр-Люббе, так і Торглеру,—гаворыць Гейзіг,— было сказана, што ў часе маючай быць вочнай стаўкі яны не павінны нічога гаварыць. Калі іх паказалі адзін другому і зноў развялі, Ван дэр-Люббе было задана пытанне: ці ведае ён гэтага чалавека. Ван дэр-Люббе адказаў—«Не».

Пасля Гейзіга дае паказанні другі паліцэйскі камісар, Сірпіус. Зак гаворыць, зварачаючыся да гэтага сведкі: «У разуме пратаколаў нашых допытаў аб Ван дэр-Люббе вы гаворыце, што Ван дэр-Люббе катэгарычна сцвярджаў, што ён адзін зрабіў гэтыя падпалы, і вы там указваеце, што на нашу думку паказанні Ван дэр-Люббе ад павядаюць сапраўднасці. Сірпіус пацвярджае гэта цверджанне свайго рэзюме.

Пасля Сірпіуса ў ролі «сведкі» выступае трэці паліцэйскі камісар Мароўскі. На пытанне старшыні, ці заявіў Ван дэр-Люббе пры допыце, што ён комуніст, Мароўскі адказвае: «Так», і пры гэтым ён смяяўся. Далей сведка заяўляе, што пры допыце Ван дэр-Люббе назваў яму «імёны комуністычных дэпутатаў рэйхстага Піка і Флорына». На пытанне пракурора, ці ведаў Ван дэр-Люббе гэтых дэпутатаў, Мароўскі адказвае: «Ён добра ведаў іх імёны, у прыватнасці, імя Піка ён нібыта чуў у Галандыі».

Пасля гэтага «доказа» мнімай сувязі Ван дэр-Люббе з компартыяй сведка для большай пераканаўчасці дадае: «У мяне было ўражанне, што пры першых сваіх допытах Ван дэр-Люббе хацеў выдаць яшчэ іншых людзей, але потым ён змяніў сваю тактыку».

Пасля гэтага Дзімітраў задае Мароўскаму пытанне: «З якога часу на допы ты Ван дэр-Люббе быў запрошан перакладчык?». Старшыня па прапанове абаронцы Зака пытаецца ў Дзімітрава, з якой мэтай ён задае гэта пытанне.

Дзімітраў: «Пры маіх допытах з самага пачатку прысутнічаў перакладчык, хоць я добра ведаю нямецкую мову».

Далей Дзімітраў пытаецца: «Ці задаваў Мароўскі ў часе допыта Ван дэр-Люббе пытанне аб ім, Дзімітраве?». Мароўскі адказвае: «Не, я, не называючы імя, паказаў Ван дэр-Люббе фотаграфіі астатніх абвінавачаных і ён, заявіў, што гэтых людзей не ведае».

**Тут старшыня заяўляе** Дзімітраву: «Дзімітраў, мая цярплівасць у адносінах вас вычарпальна. Я пазбаўляю вас на сёння права задаваць пытанні сведкам».

## СКАНДАЛЬНАЕ БАНКРУЦТВА ФАШЫСЦКАЙ АВАНТУРЫ

ПАРЫЖ, 27.

Друк канстатуе, што значная частка 5-га пасяджэння лейпцыгскага суда звялася да адкрытай барацьбы паміж старшынёй і Дзімітравым, які сваімі пытаннямі ставіў суд у трудное становішча.

### „МАЎЧАЦЬ!"— МЕТАДЫ БЮНГЕРА

«Пці Парыж'ен» апісвае адзін з інцыдэнтаў, якія адбыліся паміж Дзімітравым і старшынёй.

«Я лічу неабходным пратэставаць, — заявіў Дзімітраў, — супроць тэндэнцыйных артыкулаў германскага друку, якія вусім відавочна, прабуюць ачарніць мяне і пагубіць».

**«МАЎЧАЦЬ,** — раздаецца ваенная каманда Бюнгера. — Пытанні, якія датычаць прэсы і журналістаў, не маюць ніякіх адносін да гэта, што адбываецца тут».

«Я вымушан абараняцца сам, — пачаў было гаварыць Дзімітраў.—Я канстатую...»

Бюнгер зноў перабівае яго. «Вы нічога не павінны канстатаваць. Замаўчыце. Трымайце сябе спакайней».

Як заяўляе друк, пытанні, што задаваліся Дзімітравым, узрывалі сляпяючае хлусні, правакацыі і падлогаў, якія называюцца абвінавачэўным актам. Бюнгер абараняе Ван дэр-Люббе ад пытанняў Дзімітрава.

Такава агульная ацэнка ўсіх газет. Гэта кідае новае святло на падазроснае маўчанне Ван дэр-Люббе, які на папярэднім следстве пры адсутнасці старонніх сведак з найвялікшай ахвотай тавараў усё, што ад яго патрабавалі.

— Ван дэр-Люббе зараз маўчыць, бо яго прымушаюць маўчаць суд і ўлады, якія баяцца, што ён праговорыцца і сарве ўсю інсцэніроўку, — піша «Юманіта».

### ПРАВАЛ СУДОВЫХ ВЕРСІЙ

«Уражанне ад працэса такое, — піша Гавас, — што над гэтай справай лунае нейкая тайна, якую як быццам ніхто не спяшаецца раскрыць. Гэта дае падставы для самых розных дапушчэнняў. Так, у кулуарах суда цыркулявала чутка, што фізычны стан Ван дэр-Люббе тлумачыцца дрэнным абыходжаннем з ім».

Газеты адносяцца з найвялікшым скептыцызмам да афіцыяльнай судовай версіі аб першых падпалах, нібыта зробленых Ван дэр-Люббе. Агалашэнне на судзе дэкларацыі Ван дэр-Люббе ад яго «палітычных пераканаццях» спаткала друкам з такім-жа недавер'ем. «Можа паказацца дзіўным, — зазначае Гавас, — што гэта дэкларацыя напісана найлепшай нямецкай мовай і змяшчае складаныя выразы, якіх гэты галандскі друкар, які дрэнна ведае нямецкую мову, мабыць, ніколі і не ўжываў».

### ТРЫВОГА РЭЖЫСЕРАЎ ПРАЦЭСА

Пераходзячы да характарыстыкі Торглера, «Тан» заяўляе:

«Ні адзін момант у пазіцыі Торглера не паказвае, каб ён быў здольны на ўчынкі, падобныя ўчынкам бадзяні Ван дэр-Люббе. Усё гэта дае падставу канстатаваць, што недарэмна германскі друк баіцца, што рэжысерам працэса не ўдасца ўстанавіць сувязі паміж падпальшчыкамі рэйхстага і комуністамі».

Спецкор «Журналь» выкрывае чарговую спробу арганізатараў працэса зняць з сябе падазрэнні з повану дзіўных паводзін Ван дэр-Люббе. Справа ідзе аб «экспертызе», зробленай у часе перапынку нейкім галандскім нацыянал-сацыялістскім журналістам і шведскім прафесарам, які знаёмы, быццам Ван дэр-Люббе ў нармальным фізычным стане і не выявіў у яго адзнакаў набояў. Газета зазначае, што ніхто з ангельскіх і французскіх журналістаў не мае доступа да Ван дэр-Люббе.—Чаму пры гэтым агладзе, — пытае «Журналь», — не прысутнічаў Стоміс, які сочыць з самага пачатку за судовым следствам.

## СТАРШЫНЯ СУДА МУШТРУЕ ВАН ДЭР-ЛЮББЕ

ВАРШАВА, 27. (БЕЛТА).

Лейпцыгскі карэспандэнт газеты «Ілюстраваны кур'ер цэдзёны» піша:

«Ход сёняшняга разбора канчаткова пераконвае, што працэс аб падпалах рэйхстага з'яўляецца звычайным прапагандысцкім мерапрыемствам і прытым вельмі найвыразным».

Карэспандэнт падкрэслівае ролю старшыні Бюнгера, які, не будучы здольным дабіцца ад Ван дэр-Люббе якіх-небудзь талковых адказаў, сам падказваў яму выгодныя для абвінаваўчага акта паказанні.

Карэспандэнт адзначае, што, не глядзячы на «тэатральныя» намаганні старшыні выцягнуць ад Ван дэр-Люббе «комуністычную дэкларацыю», падсудны ка-ранейшаму ўпарта маўчаў. У гэтых выпадках старшыні прыходзілася агалашаць класічную на гэтым працэсе формулу «падсудны не пярэчыць». У канчатковым выніку старшыня, паводле слоў карэспандэнта, сказаў ад імя Ван дэр-Люббе «палкую комуністычную прамову, у часе якой Ван дэр-Люббе як быццам засынаў, апускаючы галаву ўсё ніжэй». І калі перакладчык растлумачвае змест «паказанняў» Ван дэр-Люббе падсудным балгарам, паміж апошнімі і старшынёю суда адбываецца рэзкі канфлікт».

Словы, гвалт, тэрор, вымаганне — піша карэспандэнт, — вісяць у паветры, і толькі ўмяшанне старшыні папярэджвае асвятленне таямніц гітлераўскага следства. Указваючы, што рад пытанняў Дзімітрава не быў дапушчан, карэспандэнт заяўляе, што «неадкладная рэакцыя трыбунала супроць спроб высвятлення тайны людзмі, якіх не зламала нават гітлераўскае следства, выкрывае тэндэнцыю судовага разбора, якая мае толькі адну мэту: пацверджаў не ўсіх тэзісаў абвінавачання з боку Ван дэр-Люббе».

## „ТРАГІЧНЫ МАСКАРАД"

### КАМЕНТАРЫІ ФРАНЦУЗСКАЙ ПРЭСЫ

ПАРЫЖ, 27. (БЕЛТА).

Бліжэй да ўрада «Эр нувель» піша:

«Выклікаючы ўсеагульнае адзіўленне лейпцыгскі працэс з'яўляецца трагічным результатам той абстаноўкі, у якой германскі ўрад пабудаваў абвінавачанне і правёў судовае следства. Трагічны маскарад працягваецца. З гэтага часу ўвесь свет павінен ведаць, як разумеюць германскія ўлады правасуддзе і да якіх сродкаў яны здольны зварачацца для дасягнення мэт сваёй унутранай палітыкі.

**ЗУСІМ ВІДАВОЧНА, ШТО БАЛГАРСКІЯ КОМУНІСТЫ І ГЕРМАНСКІ КОМУНІСТ ТОРГЛЕР НЕ ВІНАВАТЫ У ЗЛАЧЫНСТВЕ, ЯКОЕ ПРЫПІСВАЕЦЦА У ІНТАРЭСАХ ГРУБЕЙШАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ МАХІНАЦЫІ.** Падсудныя, змучаныя шэсцьма месяцамі знявольвання, праведзенага ў кайданах, пазбаўлены ўсіх правоў і гарантый, прызнаваемых законамі і звычаямі ўсіх культурных краін».

Закрапаючы совецка-германскі канфлікт у сувязі з недапушчэннем представіцелькоў совецкага друку на Лейпцыгскі працэс, газета піша:

«Нацыянал-сацыялісты бессаромна не лічацца ні з правіламі міжнароднай ветлівасці, так і правамі, якія не падпадаюць пад сумненне ні ў адной цывілізаванай краіне. Могуць сказаць, што гэта ўсяго толькі новая абражаючая выхадка у адносінах да замежнай дзяржавы. Несумненна. Але гэта выхадка не прымусіла доўга чакаць адказа. Совецкі ўрад парашыў адазваць усіх совецкіх карэспандэнтаў з Германіі і прапанаваў карэспандэнтам германскага друку пакінуць Совецкі саюз у трохдзённы тэрмін. Вось ясны і хуткі метад, аб якім, можа быць, будзе карысна успомніць і іншым дзяржавам».

## „ДОПЫТ ПЕРАТВАРАЕЦЦА Ў ФАРС"

### АНГЕЛЬСКАЯ ПРЭСА АБ ЛЕЙПЦЫГСКІМ ПРАЦЭСЕ

ЛОНДАН, 27. (БЕЛТА).

Друк вельмі шырока расцэньвае новыя метады, якія практыкуюцца судом пры допыце Ван дэр-Люббе і заключаюцца ў агалашэнні поўнага тэксту яго паказанняў на папярэднім следстве.

Карэспандэнт «Морнінг пост» адзначае ў сувязі з гэтым указанне, быццам Ван дэр-Люббе перад пажарам рэйхстага зрабіў яшчэ з іншых падпалы. Карэспандэнт іранічна падкрэслівае, што Ван дэр-Люббе, «як відаць, працаваў з выключнай шпаркасцю, калі прыцягнуць пад увагу яго марудлівую галандзкую натуру». Карэспандэнт «Н'юс хронік» таксама ўказвае, што, мяркуючы паводле гэтых даных, Ван дэр-Люббе як псіхічна, так і фізічна «павінен быў быць падобным да малалікі».

Карэспандэнт «Таймс» адзначае, што допыт «ператвараецца ў фарс» і многазначна падкрэслівае, што — «калі рэнейшым паказанням Ван дэр-Люббе надаецца такое вялікае значэнне, дык было-б цікава даведацца, якімі метадамі гэтыя паказанні здабываліся».

Паводле слоў карэспандэнта «Дэйлі тэлеграф», «было-б вельмі важна высвет ліць, ці былі першыя паказанні Ван дэр-Люббе сапраўды «добраахвотнымі».

Карэспандэнт Рэйтэр намякае, што выклікае сумненне, ці даваў наогул Ван дэр-Люббе гэтыя паказанні на папярэднім следстве. Карэспандэнт, у прыватнасці, спыняецца на заявах, нібыта зробленых Ван дэр-Люббе адносна яго палітычных матываў. Паводле слоў карэспандэнта, гэтыя заявы складзены «на вучонай нямецкай мове і падобны да вытрымак з філасофскага твора. Цяжка сабе ўявіць, каб яны выходзілі ад гэтага запалоханага дурнаватага чалавека».

Наколькі цяжка становішча арганізатараў працэса, відаць таксама з таго, што рэакцыйная «Дэйлі мейль», якая цалкам падтрымлівае нацыянал-сацыялістаў, сёння не змяшчала ніякіх паведамленняў аб працэсе.

## МАНЕЎРЫ ФАШЫСЦКАЙ ЮСТЫЦЫІ

ПРАГА, 27 (Белта).

Чэхаславацкі друк, які ўжо раней адносіўся вельмі крытычна да лейпцыгскага працэса, пасля ўчарайшага пасяджэння ўсвоіў тон простага здзеку.

«Прагер Тагеблат» заяўляе:

«Тое, што здарылася ўчора ва ўрачыстай залі імперскага суда, паказвае, наколькі кіраўнікі працэса замяшаны тым, што пасля 5 дзён разбора не ўдалося зрушыцца з месца».

Газета дае саркастычную ацэнку цягнуўшамуся паўгода папярэдняму следству, якое «яўна займалася толькі запісваннем вельмі падазроных паказанняў Ван дэр-Люббе».

Далей газета падкрэслівае, што прадпрыняты старшынёю суда допыт Ван дэр-Люббе ў прысутнасці сведак супярэчыць нават германскаму заканадаўству. Артыкул 243 германскага крымінальнага кодэкса гаворыць, што «допыт падсуднага павінен адбывацца ў адсутнасці асоб, якім трэба будзе даць паказанні».

Паколькі-ж следчы можа выступаць на судзе толькі як сведка, яго прысутнасць пры допыце азначае яўнае парушэнне закона.

## РЫХТУЮЦЬ КАТАЎ

ВАРШАВА. (БЕЛТА).

«Фолкс-цайтунг» паведамляе, што для вывучэння рамяства ката адабрана 5 праверэных нацыянал-сацыялістскіх штурмавікоў. Гэта мера выклікана недахватам выканаўцаў смяротных прыгавораў праз павешанне. Штурмавікі пройдуць спецыяльны курс пад кіраўніцтвам палкоўніка Векера, ката Глебрэра і камісара галоўнай паліцыі.

## ЗАЯВА ЗАМЕЖНЫХ ЮРЫСТАЎ

ПРАГА, 27 (Белта).

Газеты друкуюць заяву замежных юрыстаў, якія сабраліся ў Лейпцыгу. У заяве канстатуецца, што суд да гэтага часу ў 21 выпадку адхіліў хадайніцтва замежных абаронцаў аб дапушчэнні да абароны чатырох рэвалюцыйных абвінавачаных, у тым ліку адхілена хадайніцтва балгарскага адваката Грыгорава, не гледзячы на тое, што ён меў паўнамоцтва ад усіх трох балгар абвінавачаных.

Другі балгарскі адвакат Дзечаў, якому таксама было даручана прымаць удзел у абароне, не быў нават дапушчан у залу суда.

## ПЛАДЫ АКУПАЦЫІ

ШАНХАЙ. (БЕЛТА).

Як указвае амерыканскі журнал «Чай на ўіклі рэв'ю», важнейшымі момантамі ў цяперашнім становішчы Манчжурыі з'яўляецца тое, што Манчжурыя над японскім ваенным панаваннем стала найбольш хаотычнай, паражонай «бандытызмам» часткай кітайскай тэрыторыі, і што чужаземцы, якія пражываюць у Манчжурыі, вымушаны звярацца да мер самаабароны.

У Мукдэне былі зроблены два замахі на амерыканскае консульства. Былі зроблены таксама спробы скінуць бомбу ў будынак ангельскага консульства і разграміць чыгуначную станцыю ў Мукдэне. Бандыты прабавалі шляхам вымагання атрымаць 50 тыс. даляраў ад мукдэнскага аддзялення «Нейшэнель сіці банк», пагражалі забіць сына французскага банкіра, калі ён не ўнясе буйную суму грошай. Яны ранілі амерыканскага прадстаўніка нафтавай кампаніі «Тэхас» і г. д.

Як відаць, указвае журнал, найбольш адмоўным момантам у становішчы з цэнтра гледжання японскіх кіраўнікоў Манчжурыі з'яўляецца паведамленні аб ненадзейнасці так званых манчжурскіх войск ці мясцовых кітайскіх войск, якія былі навербаваны, выкармлены і ўзброены японцамі.

Прыводзячы далей факты аб шматлікіх выпадках паўстанняў і нясупынных хваляваннях у войсках Манчжоу-Го, журнал піша, што японцы да гэтага часу не здольны справіцца са становішчам. Нават у зоне паўднёва-манчжурскай чыгункі, якая добра ахоўваецца японскімі войскамі, ледзь не штодзень налёты на цягнікі, разбурэнне шляху і г. д. У некаторых раёнах становішча настолькі сур'ёзнае, што японцы будуюць, каком станцыі электрыфікаваны дротавымі загародамі, барыкады, не гаворачы ўжо аб тым, што цягнікі ходзяць пад узмоцненай ваеннай аховай.

Трэба таксама адзначыць, — гаворыць далей журнал, — што японцы да гэтага часу не здолелі вызваліць некалькіх амерыканскіх і ангельскіх грамадзян, захопленых бандытамі. Журнал указвае, што з 21-га ліпеня па 6-е жніўня ён атрымаў звыш 60 выразак з розных газет, апісваўшых шматлікія выпадкі бандыцкіх налётаў, якія ва многіх выпадках суправаджаліся забойствам і параненнем японскіх салдат.

Есць таксама паведамленні, што кітайскае судно пад амерыканскім сцягам выгрузіла шмат зброі на манчжурскім узбярэжжы і што на адным судне пад ангельскім сцягам, стаяўшым у Дайрэнскім парту, таксама знойдзена шмат зброі і амуніцыі. Не так даўно было апублікавана сенсацыйнае паведамленне, што японскія салдаты і служачыя японскага ваеннага склада ў Мукдэне прымаюць удзел у продажы зброі, у тым ліку кулямётаў, бандытам. Журнал падкрэслівае, што не гледзячы на хаос у Манчжурыі, такійская ваенщына да гэтага часу лічыць, што становішча ў Манчжурыі «паляпшаецца».


**ДЗЯРЖЦЫРК**
Апошнія 10 дзён СУСВЕТНЫ АТРАКЦЫЁН Берберійскія веліканы **ЛЬВЫ**
Популярныя усмірыцель-дрэсіроўшчык **БАРЫС ЭДЭР.**
У праграме: **ЯПОНСКАЯ Т УПА. 5—ЭРНАІ—5** музычны акт.
**Арабская трупа** і яшчэ 10 новых нумароў.
Пачатак у 8-30 г.
20 верасня у 2 гадз. дня **РАНІШНІК**
Прымаюць удзел **ЛЬВЫ** і УСЯ ТРУПА.

**К І О?**

„Чырвоная Зорка" Каса—ад 1 г. дня. **РОЗІТА** драма ў 8 частках У гал. ролі Мары Пікфорд
Кіно Інтэрнацыянал **НІБЕЛУНГІ** 2-я серыя „Помста Крымгільды"
Кіно „Пролетарый" **Стальны чалавек** 1-я серыя ў 7 частках
„СПАРТАК" Каса з 4 г. дня. Замежны фільм **ПАЗНАЁМЦЕ МЯНЕ** камедыя ў 7 частках.
ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ кіно-тэатр Мастацкі гукавы кіно-фільм **ЗЛАТЫЯ ГОРЫ**

**К І О?**

**Да ўвагі калгасаў, калгаснікаў і аднаасобнікаў Менскага раёна.**
**ПЛАДАГАРОДНІННАЯ БАЗА** Менскага плодагародтраста (Менск, вул. Розы Люксембург) прыводзіць прыёмку бульбы і гародніны
**НА працягу круглых сутак.**
Аплата вытвараецца на месцы.
При базе ёсць прантаварны ларок
Дырэкцыя.

**ПОЛАЦКІ БУДАЎНІЧЫ ТЭХНІКУМ**
галоўнага кіраўніцтва капітальнага будаўніцтва НКЗ СССР абвяшчае **НАБОР** студэнтаў на падрыхтоўчыя трохмесячныя **курсы** для паступлення ў тэхнікум з 1 студзеня 1934 г.
Прыём заяў на падрыхтоўчыя курсы да 1-га кастрычніка 1933 г. На курсы прымаюцца: рабочыя, калгаснікі, аднаасобнікі і асобы, падыходзячыя па соцстановішчу, маючыя адукацыю не ніжэй 6-ай групы семігодкі, ШКМ і курсы дасяткінаў. Паступаючыя павінны прадставіць у тэхнікум анкету, засведчаную сельсоветам, або саюзам, метрычны выпіс, даведку аб стане здароўя, аб соцстановішчы, дзве фотакарткі і дзве паштовыя маркі па 20 к. Заняткі на курсах пачнуцца з 1 кастрычніка 1933 г. Заявы накіроўваць па адрасе: гор. Полацак, вул. Фрунзе, будтэхнікум.
Дырэкцыя.

**Беларускі сельска-гаспадарчы інстытут** у гор. Горках абвяшчае **НАБОР** на падрыхтоўчыя курсы студэнцкага набора ў інстытут у 1934 г. На курсы прымаюцца асобы з адукацыяй не ніжэй семігодкі. Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй, сталоўкай і інтернатамі на агульных падставах са студэнтамі.
Апрача таго, інстытут абвяшчае **НАБОР на курсы** па падрыхтоўцы ў інстытут асеняга набора 1934 г. у колькасці 500 асоб.
Асобы, не залічаныя з 3-месячных курсаў у ВНУ, будуць пераведзены на 8-месячныя курсы асеняга набора 1934 г.
Дырэктар Беларускага сельска-гаспадарчага інстытута Барысенка.

**МАГІЛЕЎСКІ ЗАВОЧНЫ МЕДПАЛІТЭХНІКУМ**
абвяшчае **набор студэнтаў** на аддзяленні: 1) **фармацэўтычнае**—200, 2) пам. урача гінеколага—100. Прыём заяў праводзіцца з 15 верасня па 1 кастрычніка. Да заяў трэба прыкласці дакументы: анкету ў 2 экз. заверэную совецкімі або прафесіянальнымі арганізацыямі і асатнія дакументы згодна правіл прыёму ў тэхнікумы; паштовых марак на 40 кап. Іспыты адбудуцца па матэматыцы, фізіцы, грамадазнаўстве, беларускае літаратуры па пісьмовых заданнях за 7-годку. Курс навучання паўтара года. Заняткі пачнуцца з 1 кастрычніка 1933 г. Заявы накіроўваць па адрасе: гор. Магілеў п-Д медпалітэхнікум.
Дырэкцыя.


# СТВОРЫМ ЖЫЛФОНД ІМЯ 16-й ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА

## ЖЫЛКААПЕРАЦЫЯ АБАВЯЗАЛАСЯ ЗДАЦЬ РАБОЧЫМ ДА КАСТРЫЧНІЦКІХ СВЯТ 410 КВАТЭР

### Мабілізуем пролетарскую грамадскасць у дапамогу жыллёвай кааперацыі!

Набліжаецца вялікае пролетарскае свята—16-я гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі. Прэзідыум менскага гарсавета ў сваёй пастанове ад 18 верасня вызначыў рад канкрэтных мерапрыемстваў у галіне гаспадарчага, культурнага, матэрыяльна-бытавога і масавага абслугоўвання рабочых і працоўных горада і раёна. Адным з такіх мерапрыемстваў з'яўляецца **стварэнне жыллёвага фонда імя 16-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.**

У мінулым годзе стварэнне жылфонда імя 15-й гадавіны Кастрычніка дало вельмі станоўчыя вынікі. Канцэнтрацыя ўвагі буйніцкіх арганізацый на поўных аб'ектах, мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў, дапамога пролетарскай грамадскасці—усё гэта дало магчымасць да Кастрычніцкіх свят прадаставіць рабочым, ударнікам шмат дзесяткаў кватэр.

Гэты каштоўны метад работы трэба паўтарыць зараз—**яшчэ з большай энергіяй, настойлівасцю і арганізаванасцю.**

Пакуль што на пабудовах новых дамоў пануе форменная спячка. Будаўніцтва раскідана па вялікай колькасці аб'ектаў. Напрыклад, будаўнічая кантора гаржылсаюза праводзіць будаўніцтва адразу ў 8-мі мясцох, на чала і не закончыла **516 кватэр.** Рамонтны ўчастак будканторы разгарнуў капітальныя рамонты ў 24-х жактах, рамантуе 55 дамоў або 178 кватэр на плошчы 6.000 кв. метраў. Іншыя будаўнічыя арганізацыі (Менбуд, Белкамунбуд) таксама разгарнулі работы **шырокім фронтам.** Такі метад будаўнічых работ **распыляе** рабочую сілу, **распыляе** будаўнічыя матэрыялы, **амортызуе** вялізарныя капіталаўкладанні, прыводзіць да **кансервацыі** раду аб'ектаў і ў значнай ступені пазбаўляе рабочае насельніцтва рэзультатаў вялікіх намаганняў гарсавета ў галіне жыллёва-камунальнага будаўніцтва.

Работа шырокім фронтам у тойжа час аслабляе жасць кіраўніцтва і без таго слабага апарата гаржылсаюза і будканторы. Характэрна, што на апошнім пасяджэнні праўлення гаржылсаюза загадчык рамонтным участкам будканторы тав. **Рыер,** дакладваючы аб ходзе капітальнага рамонта жактаўскіх дамоў, не змог ясна сказаць, дзе і што робіцца. Не гледзячы на «суфлёрства» тэхніка рамонтнага ўчастка тав. **Эйдэльмана,** які сядзеў побач, т. Рыер блытаўся ў кожнай фразе як вучань, кепска вывучыўшы ўрок.

У апраўданне прарыва і т. **Рыер** і т. **Карнейка**—начальнік будканторы гаржылсаюза—спасылаліся на... недахват будматэрыялаў. А загадчык аддзела снабжэння гаржылсаюза т. **Ютар** заявіў, што з матэрыяламі не так ужо дрэнна. Труднасці, зразумела, ёсць, але **з-за недахвата матэрыялаў ні адна пабудова не была прыпынена.** Такім чынам, спроба зваліць віну за прарыў на «аб'ектыўныя» прычыны, правалілася.

Найдала таксама атрымалася са спасылаццем на недахват рабочай сілы. Т. Карнейка і Рыер скардзіліся, што рабочыя не хочуць да іх ісці працаваць, што першае пытанне, якое яны ставяць, гэта—«Як будзе ці карміць і дзе будзем жыць?» **Зусім законнае пытанне.** Але ўсё гора ў тым, што кіраўніцтва будканторы не клапоціцца аб задачах выканання істотных патрэб будаўнікоў, што кіраўніцтва будканторы забыла аб **6 умовах т. Сталіна,** выкананне якіх з'яўляецца **асноўнай прадпасылкай** для нармальнай работы кожнага ўчастка нашай соцыялістычнай гаспадаркі.

У рабоце будканторы гаржылсаюза шмат буйных недахопаў, а кантроля над яе работай па сутнасці няма. Гаржылсаюз фактычна **бяздзейнічае.** За апошнія тры месяцы не было ні аднаго пасяджэння праўлення. Будкантора не бачыць ад гаржылсаюза ніякай рэальнай дапамогі.

Гэтым у асноўным тлумачыцца тое, што ў нас так дрэнна з будаўніцтвам па лініі жыллёвай кааперацыі.

Стварэнне жыллёвага фонда **імя 16-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі** павінна пакласці канец неахайнасці і безадказнасці. Гаржылсаюз узяў на сябе соцыялістычнае абавязацельства здаць у эксплаатацыю да 16-ай гадавіны Кастрычніка **284 новых кватэр і 126 кватэр з капітальнага рамонта.** Гэта абавязацельства павінна быць поўнасцю выканана. Гаржылсаюз павінен неадкладна перабудаваць сваю работу такім чынам, каб здолець **аперацыйна** кіраваць жыллёвым будаўніцтвам. Разам з прафсаюзамі ён павінен мабілізаваць пролетарскую грамадскасць у дапамогу будоўлям. Для гэтага ў першую чаргу трэба дабіцца **замацавання будуемых кватэр за іх будучымі жыхарамі,** г. зн. выдаць кожнаму рабочаму ордэр з указаннем дома і кватэры, якая яму прызначаецца.

Трэба павесці масавую работу, каб прымацаваныя аказвалі сапраўды рэальную дапамогу будаўніцтву, шляхам стварэння **брыгад садзейнасці, скразных брыгад, грамадскіх кантралёраў,** шляхам арганізацыі **суботнікаў.**

Трэба максімальна **сканцэнтраваць** на кастрычніцкім жылфондзе рабочую сілу, транспарт і будматэрыялы.

Барацьба за жылфонд імя 16-й гадавіны Кастрычніка не з'яўляецца абавязкам адной толькі жыллёвай кааперацыі. У гэтай барацьбе актыўны ўдзел павінны прымаць **прафсаюзы, фабзаўкомы.** На кожным прадпрыемстве, звязаным з жыллёвым будаўніцтвам, трэба вылучыць спецыяльныя брыгады **аперацыйнай дапамогі.** Трэба вылучыць адказных чле наў фабзаўкомаў у дапамогу жыллёваму будаўніцтву. Мэтазгодна заключыць дагаворы паміж гаспадарчымі, прафсаюзнымі і будаўнічымі арганізацыямі на ўзаемную дапамогу па садзейнасці будаўніцтву кастрычніцкага жылфонда.

Роля прафсаюзаў у гэтай справе велізарная. Яны павінны забяспечыць не толькі дапамогу для своечасовага скончэння будаўніцтва і рамонтаў, але і пасяліць у новыя кватэры **лепшых ударнікаў вытворчасці.** Вакол гэтай вялікай палітычнай задачы трэба мабілізаваць усю рабочую масу.

Пролетарская грамадскасць павінна аказаць жыллёвай кааперацыі магчымальную дапамогу ў выкананні ўказанага ёю соцыялістычнага абавязацельства—даць ударнікам фабрык і заводаў 410 новых кватэр.

Трэба спатэвацца, што прэзідыум ЦСПСБ і гарпрафсавет падтрымаюць гэту ініцыятыву.

П.

# Конкурс на лепшы жакт

**ПАСТАНОВАЙ ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРСОВЕТА** абвешчан **КОНКУРС НА ЛЕПШЫ ЖАКТ.** Мэта конкурса — выявіць лепшыя ўзоры работы жактаў, дабіцца рашучага пералома ў галіне захавання жыллёвай плошчы, свячасовага скончэння рамонтаў, падтрымання ўзорнага парадка і чыстаты ў кватэрах, дварах і вуліцах, шырокага разгортвання масавай і культурнай работы, бытавога абслугоўвання і г. д.

**ЛЕПШЫЯ ЖАКТЫ,** лепшыя старшыні праўленняў жактаў, загадчыкі дамамі, дворнікі, активісты, рабкоры, якія актыўна будуць прымаць удзел у асвятленні хода конкурса ў цэнтральным і жактаўскім друку, будуць прэміраваны. Для прэміравання створан фонд у суме 18.000 руб.

**ЦЭНТРАЛЬНАЙ ФІГУРАЙ КОНКУРСА З'ЯЎЛЯЕЦЦА ДВОРНІК.** Ад яго галоўным чынам залежыць чыстата і парадак у жактаўскіх уладаннях. Да рэчы, дворнікі вельмі слаба ўцягнуты ў грамадскае жыццё жактаў і гэтым у значнай ступені тлумачыцца тое, што некаторыя двары і вуліцы з'яўляюцца ўзорам антысанітарыі (напрыклад, жакты № № 3, 4, 16, 17, 46, 48, 49 і інш.).

**ЛЕПШЫЯ ДВОРНІКІ** атрымаюць 15 прэмій. Першая прэмія — курорт з аплатай за праезд і 100 руб. грашыма. Другая прэмія — зімняе паліто, боты і 50 руб. грашыма (другіх прэмій—2). Трэцяя прэмія — гарнітур і 25 руб. грашыма (трэціх прэмій — 2). Чацвертая прэмія — боты (тры прэміі). Пятая прэмія — ватны гарнітур (тры прэміі). Шостая прэмія — бацінкі (чатыры прэміі). Апрача таго, усім прэміраным будуць выданы ганаровыя граматы гарсовета і гаржылсаюза.

**ПАСТАНОВА** прэзідыума гарсовета і пагажэнне аб конкурсе будуць выданы асобнай пістоўкай і разасланы па ўсіх жактах.

**25 ВЕРАСНЯ** ў клубе будаўнікоў адбылася нарада старшынь праўленняў жактаў, загадчыкаў дамамі, дворнікаў разам з членамі конкурснай камісіі. З дакладам аб задачах конкурса выступіў загадчык камгасам тав. **БІМБАТ.** У спрэчках выказалася 15 чалавек.

**БОЛЬШ ЗА ЎСЁ СКАРГАЎ** было на дрэнная кіраўніцтва з боку гаржылсаюза. Асабліва кепска нападжана снабжэнне дэфіцытнымі будматэрыяламі. Каб набыць адну дошку або кілограм цвікоў, загадчык дамамі павінен абегчы паўгорада. Некаторым кіраўнікам жактаў удаецца атрымаць невялікую колькасць будматэрыялаў выключна па «знаёмству». Гэта часта прыводзіць да злоўжываванняў. Аб злоўжываннях на нарадзе не гаварылі. Імі «хваліліся» ў кулуарах. Так, адзін загадчык дамамі расказаў, як ён «дастаў» 7 скрынак цвікоў. «Абклеіў свайму жыхару кватэру і атрымаў цвікі»... Вось вынікі ігнаравання патрэб жактаў з боку гаржылсаюза! Першы практычны вывад, які трэба зрабіць з нарады—гэта ЦЭНТРАЛІЗАВАЦЬ СНАБЖЭННЕ ЖАКТАЎ ДЭФІЦЫТНЫМІ БУДМАТЭРЫЯЛАМІ ДЛЯ БЯГУЧЫХ РАМОНТАЎ шляхам стварэння пры гаржылсаюзе СПЕЦЫЯЛЬНАГА ФОНДА.

**АДНАЧАСОВА** трэба мабілізаваць унутраныя рэсурсы ў самых жактах. Не сакрэт, што ў некаторых жактах ёсць значныя запасы розных будаўнічых матэрыялаў, часта нават непатрэбных гэтаму жакту. Хаваюць проста «на ўсякі выпадак». Трэба стварыць брыгады праверкі і выявіць тое, што ляжыць на складах жактаў, што можна перадаць іншым жактам для скончэння бягучых рамонтаў.

**АСАБЛІВА ВОСТРА** адчуваецца недахват цвікоў. У некаторых удзельнікаў нарады з'явілася думка мабілізаваць на гэту справу пі